ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 46 (1120) 16 лістапада 2013 г.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

БАЛЕТ У НОВЫМ ФАРМАЦЕ

19 — 24 лістапада ў Віцебску пройдзе XXVI Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі (IFMC), а яго ўрачыстае адкрыццё адбудзецца ў Мінску ўжо заўтра! Але галоўнае новаўвядзенне на гэтым штогадовым свяце — новы фармат нацыянальнага конкурсу.

Сцэна з балета "Дождж" на леташнім форуме ў пастаноўцы старшыні журы сёлетняга беларускага конкурсу ў рамках IFMC Раду Паклітару.

С. 2

Пытанні да сенатара: "гарачая лінія" "К" С. 10 — 12

Чатыры нашы прэм'еры запар: **а які вынік?** С. 7

Натуральны адбор: музеі — кансерватары? С. 13

Сучаснае кіно **па версіі Кіры Муратавай** С. 6

Прэзент-альбомы: са сценамі, ды **без людзей...** С. 4

Чаму ў QR-бібліятэцы **амаль няма сучаснікаў?** С. 3

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

Соцыум

Вось-вось абрынецца. Ці не?

Апублікаваўшы на нашых старонках артыкулы пра Тадэвуша Рэйтэна і лёс ягонай сядзібы (гл. "К" у №№ 11, 33, 34), арткуратар Зміцер Юркевіч паабяцаў спрычыніцца да адраджэння котлішча гэтага роду ў Грушаўцы сваімі ўласнымі сіламі. І стрымаў слова. Пасля суботніка, зладжанага разам з прадстаўнікамі калектыву нашай рэдакцыі, а таксама чарговага фэсту "Дах", што прайшоў непасрэдна ў той невялікай вёсцы, распачаліся работы і ўласна па кансервацыі помніка спадчыны.

Усе тыя захады "К" падрабязна асвятляла на сваіх старонках (гл. № 34). Такая ўвага менавіта да гэтага аб'екта — невыпадковая, улічваючы і яго несумненную гісторыка-культурную значнасць, і цяперашні стан — таксама, на жаль, несумненны. А таксама — наяўнасць шчырай ініцыятывы, якую грэх не падтрымаць.

Напярэдадні першага снегу ў сядзібе прайшлі некалькі суботнікаў, прызначаныя паставіць лагічную кропку пачатковага этапа яе рэвіталізацыі. Не ў адзін з іх сваю сціплую лепту ўнёс і карэспандэнт "К".

Дажыць да вясны

Прыземістая камянічка праваруч ад грушаўскага палаца выглядае надзвычай сціпла, але... Не ўсё тое золата, што блішчыць, — і, натуральна, наадварот. Гэта — звышкаштоўны гістарычны артэфакт, адзіная пабудова сядзібы, муры якой памятаюць самога Тадэвуша Рэйтэна. Больш за тое: у іх прайшлі апошнія гады ягонага трагічнага жыцця. Але сёння куды важней іншае: менавіта "мураванка" займае першую пазіцыю ў "групе рызыкі" з усяго занядбанага ансамбля. Падняўшыся на яе паддашак, разумееш гэта яшчэ больш выразна: будынак рассыпаецца літаральна ад лёгкага дотыку рукі!..

Працяг артыкула пра лядашчую сядзібу ў Грушаўцы чытайце на старонках 4 — 5.

Фотасюжэт нумара

Фота Уладзіслава МІГДАЛЁНКА

АСЛЮК ЗДЫМАЕ ПАВОДЛЕ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

С. 3

Падзея

Беларусь: факты ды імідж

На пачатку снежня ў Мінску пройдзе міжнародны форум "Імідж Рэспублікі Беларусь". Ён ладзіцца ўжо чацвёрты раз.

Мяркуецца, што на гэтай сустрэчы ўвага будзе засяроджана на тых выгодах, якія могуць займець гарады, рэгіёны і краіна ўвогуле праз набыццё станоўчага іміджа. Працаваць на форуме маюць тры секцыі. На іх гаворка будзе весціся пра піяр гарадоў і рэгіёнаў, пра скарыстанне ў гэтай справе Сеціва і пра так званы падзейны турызм.

Напярэдадні форуму адбылася прэс-канферэнцыя з удзелам прадстаўнікоў міністэрстваў і іншых дзяржаўных структур, якім даручана рупіцца пра імідж краіны. Журналістам паведамілі, што сёлета Міністэрства замежных спраў паклала пачатак новаму інтэрнэт-праекту "Беларусь. Факты", які мае інфармаваць замежжа пра нашу краіну. Кожны, хто захоча наведаць Рэспубліку Беларусь і звернецца ў беларускія пасольствы па інфармацыю, зможа, дзякуючы рэалізацыі згаданага праекта, пазнаёміцца з тымі або іншымі аспектамі жыцця нашай краіны, даведацца пра яе гісторыю і культуру.

А сёння найбольш перспектыўнымі чыннікамі іміджа краіны для ініцыятараў праекта "Беларусь. Факты" ўяўляюцца прырода і этнаграфія.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Фестывалі

Балет у новым фармаце

Міжнародны і нацыянальны конкурсы, што праходзяць у рамках Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі, чаргуюцца між сабой. Сёлетні — нацыянальны. Звычайна на кожным з конкурсаў існавалі дзве намінацыі — "Аднаактовы балет" і "Харэаграфічная мініяцюра". Але апошнім часам і колькасць работ была ў іх надта адрознай, і, шчыра кажучы, узровень.

Сёлета вырашылі ад намінацый адмовіцца. Да таго ж, размяркоўваць пяць раўназначных прызоў, якімі адзначаць калектывы менавіта за найбольш адметныя іх рысы, — замест Першай, Другой і Трэцяй прэмій, як бывае часцей за ўсё.

Хто ж будзе прызнаны лепшым? На конкурс было пададзена больш за 20 заявак, з іх абралі 13 калектываў, прычым з усіх абласцей Беларусі. Больш за ўсё, ажно пяць, — з Мінска. Яшчэ тры — з Віцебска. Сярод прэтэндэнтаў на ўзнагароды — не толькі пачаткоўцы, але і такія добра вядомыя ў рэспубліцы ды замежжы гурты, неаднаразова ўганараваныя на прэстыжных замежных спаборніцтвах ды паказах, як гродзенскі "ТАД", што сёлета адзначае сваё 25-годдзе, сталічныя "D.O.Z.SK.I", якія запрошаны не толькі ў конкурсную, але і ў гасцявую праграмы IFMC.

Гасцявыя калектывы на гэтым фестывалі штогод вельмі адметныя. Ёсць і заўсёднікі — той жа "Балет Яўгена Панфілава" з Пярмі (Расія), які пакажа гэтым разам дзве свае ранейшыя работы, што ўжо прывозіў у Беларусь, але ў іншыя гарады. Філасофскую пастаноўку "Клетка для папугаяў" убачаць мінчане, спектакль "Рамэа і Джульета" — віцябчане і маладзечанцы. З Ізраіля прыедзе калектыў "Fresco Dance Company". Яго балет "Цэрбер" стане своеасаблівай фестывальнай "аркай", будзе дэманстравацца на адкрыцці свята ў Мінску і на закрыцці ў Віцебску.

Салісты Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі неаднаразова ўпрыгожвалі віцебскае свята паказам асобных нумароў. Сёлета наш тэатр упершыню прывязе на фестываль аднаактовы балет, прэм'ера якога адбылася месяц таму, — "Шэсць танцаў" у харэаграфіі сусветна знакамітага Іржы Кіліяна.

Багатыя гасцявая і конкурсная праграмы — яшчэ не ўвесь фестываль. Неад'емнай часткай IFMC даўно стаў насычаны адукацыйны складнік. Сёлетнія майстар-класы асабліва разнастайныя. Ва ўдзельнікаў будзе магчымасць пазнаёміцца з творчымі і педагагічнымі метадамі майстроў з Беларусі, Германіі, Канады, Літвы, Расіі. Ад беларускай "прафесуры" выступіць Вольга Лабоўкіна — былая выхаванка Дзмітрыя Куракулава з Гродна, якая заснавала вельмі "раскручаны" сёння сталічны гурт - "Каракулі".

Як заўсёды, фотамастакі прадэманструюць на фестывалі свае "спыненыя імгненні". У фае Канцэртнай залы "Віцебск", дзе традыцыйна праходзяць асноўныя мерапрыемствы IFMC, разгорнуцца дзве выстаўкі. Да таго ж, акрэдытаваныя фотакарэспандэнты, як абвешчана, будуць паказваць свае здымкі он-лайн.

Н.Б.

Акцэнт тыдня

Лялечнікі ў "…Масцы"

Надзея БУНЦЭВІЧ,
рэдактар аддзела газеты "Культура"

Расійская нацыянальная тэатральная прэмія "Залатая Маска" можа папоўніцца імёнамі чатырох беларускіх творцаў. У намінацыі "Лялькі: работа рэжысёра" вылучаны Алег Жугжда і Аляксандр Янушкевіч. За работу мастака ў тых жа спектаклях намінаваны Валерый Рачкоўскі і Людміла Скітовіч.

Дадуць ці не дадуць "…Маску", гадаць не будзем. Ганарова ўжо само вылучэнне. Бо яго, як зразумела і без каментарыяў, рабіў не беларускі бок, а расійскія тэатры, якія запрашалі нашых пастаноўшчыкаў. Дзякуючы гэтаму ў Разані быў пастаўлены спектакль "…і пакаранне". У горадзе Кургане, па ініцыятыве і пры падтрымцы творчага аб'яднання "КультПраект" (Масква) — спектакль "Эдып".

Што ж, парадуемся за нашых творцаў. Тым больш, што беларускія "лялечных спраў майстры" даўно ўжо знайшлі прызнанне ў замежжы, у тым ліку на самых прэстыжных еўрапейскіх фестывалях і пляцоўках. Дый наша айчынная Нацыянальная тэатральная прэмія, якая праводзілася двойчы, засведчыла, што лялечнікі, асабліва гродзенскія і сталічныя, — "наперадзе планеты ўсёй". "Пікавая дама" таго ж Алега Жугжды стала сапраўдным тэатральным "бестселерам". Аляксей Ляляўскі быў адзначаны за лепшую рэжысуру ("Драй швэстэрн"). Ягоны вучань Аляксандр Янушкевіч таксама зарэкамендаваў сябе адным з самых "крутых" эксперыментатараў, асабліва ў спектаклях "Вянчанне", "Дзяды" і нават у дзіцячым "…Карлсане". Дзеці і дарослыя добра ведаюць лялькі мастака Валерыя Рачкоўскага, які выпусціў безліч спектакляў. Людміла Скітовіч працуе ў Магілёве, але сталічным тэатралам знаёма яе афармленне пастаноўкі "Дзівосныя авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага", што паказвалася летась у рамках Творчай лабараторыі на базе Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек.

Але да радасці прымешваюцца і ноткі горычы: беларуская Нацыянальная прэмія сёлета "адпачывае". Яе вырашылі праводзіць раз на два гады. Вядома, грошы любяць падлік, але ж хочацца, каб нашы майстры знаходзілі як мага часцей падтрымку ды пашану на радзіме. Бо нярэдка здараецца наадвапрот: айчыннае ўганараванне, на жаль, прыходзіць як "водгук" на замежнае. А ў нас на таго "дзівака", не падобнага на іншых, глядзяць падазрона: маўляў, чаго ён "выкручваецца"…

Праекты

Купала ў дыялогах культур

Дзякуючы супрацоўніцтву міністэрстваў культуры Беларусі і Латвіі, нашага Літаратурнага музея Янкі Купалы і латвійскага Музея Райніса і Аспазіі мінская грамада атрымала магчымасць пабачыць выстаўку, прысвечаную жыццю і творчасці сусветна вядомага латышскага паэта, перакладчыка, драматурга Яна Райніса.

На сувязях Райніса з беларускай культурай, знаёмстве з Янкам Купалам, творчым сугуччы двух геніяў зрабілі акцэнт арганізатары выстаўкі. Яна разгорнута ў Купалаўскім музеі пад назвай "Я вам прынёс напеў зямлі бацькоўскай…". Сярод экспанатаў — асабістыя рэчы Райніса, прысвечаныя паэту мастацкія творы, кнігі, падораныя яму беларускімі аўтарамі, у тым ліку — Купалам.

Наш сегмент гэтай выстаўкі складаецца з экспанатаў Музея Янкі Купалы, якія адлюстроўваюць сувязь творчай спадчыны Песняра з культурай Латвіі.

А тэме "Янка Купала і Славакія" прысвечана імпрэза, што пройдзе ў Купалаўскім музеі 18 лістапада. Гэта частка культурна-адукацыйнага праекта "Беларусь — Славакія. Дыялог культур". На ёй, сярод іншага, будзе агучаны пераклад на славацкую мову верша нашага класіка "Мая малітва". Ён зроблены Марыянам Сэрваткам — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Славацкай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь у 2008 — 2013 гадах.

Фотафакт

Шкло, кераміка, хакей...

У павільёне "БелЭКСПА" на вуліцы Янкі Купалы праходзіць Міжнародная спецыялізаваная выстаўка "Свет шкла і кераміка".

Гэта не форум пластычных ідэй, а — кірмаш, дзе прадпрыемствы і майстры дэманструюць грамадзе прадукцыю ў спадзяванні, што іх заўважаць ды годна ацэняць. Таму і прадстаўленае тут арыентавана на густы беларускіх спажыўцоў. Задача ў дадзеным выпадку — не здзівіць, а прадаць. І тым, хто хацеў бы аздобіць сваё жытло чымсьці звыкла прыгожым, тут ёсць з чаго выбіраць.

Праўда, пэўную адметнасць у экспазіцыю ўнёс маючы адбыцца ў наступным годзе Чэмпіянат свету па хакеі. Сям-там традыцыйныя вобразы народнага ўмельства скарэктаваны на хакейную тэматыку. Ёсць і асобны стэнд з праектам прызоў для ўдзельнікаў і гасцей Чэмпіянату.

Страта

Апошняе казанне

Не стала Міхаіла ДРУЖЫНЫ

Сумная вестка — бы чорны плашч, якім так любяць ахінацца оперныя героі. Але замест мефістофелеўскай чорнай дзіркі ў душы тут — цяжкі смутак. Мы развіталіся з Міхаілам ДРУЖЫНАМ — салістам Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, удзельнікам Вялікай Айчыннай і проста вельмі светлым чалавекам, адданым мастацтву.

Міхаіл Афанасьевіч шмат у чым адпавядаў свайму прозвішчу: надзейны, безадмоўны, без аніякіх "зорнасцей". І з абсалютна стабільным вакалам. Ён умеў ахоўваць — Радзіму, блізкіх і сяброў, свой голас. Ягоны бас чулі прыхільнікі оперы розных пакаленняў: у "Яўгеніі Анегіне", дзе ён спяваў Грэміна, у "Іване Сусаніне", дзе ён увасабляў галоўнага героя, у "Русалцы" (Млынар), "Хаваншчыне" (Дасіфей), "Князі Ігары" (Хан Канчак), "Залатым пеўніку" (Цар Дадон), "Арэстэі" (Агамемнан), "Фаўсце" (Мефістофель), "Севільскім цырульніку" (Дон Базіліа), "Дон Карласе" (Інквізітар), "Гальцы" (Стольнік), "Дон Жуане" (Камандор), у беларускіх операх — Аляксея Туранкова, Мікалая Аладава, Юрыя Семянякі, Генрыха Вагнера, Дзмітрыя Смольскага. Калі ў апошнія гады працы ў тэатры ён выходзіў Піменам у "Барысе Гадунове", удзячная зала ўспрымала і яго самога як "жывы летапіс" тэатра: "Яшчэ адно, апошняе казанне…".

Жыццёвы "летапіс" Міхаіла Дружыны скончаны. Творчы — жыве і пасля смерці…

Рэдакцыя "К"

Калектыў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь выказвае шчырыя спачуванні родным, блізкім і сябрам з выпадку смерці ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь ДРУЖЫНЫ Міхаіла Афанасьевіча.

Культурны твітар: мы ў свеце

Аўстрыя

Прэзентацыя кнігі беларускіх даследчыкаў А.Шаркава і В.Селемянёва "Воінскія пахаванні Першай сусветнай вайны ў Беларусі" адбылася ў параднай зале аўстрыйскага Ваенна-гістарычнага музея ў Вене. У імпрэзе, прысвечанай 100-годдзю з пачатку Першай сусветнай вайны, што адзначаць у 2014-м, бралі ўдзел Пасол Беларусі ў Аўстрыі Валерый Варанецкі, навукоўцы-гісторыкі, кіраўнікі дзяржустаноў і грамадскасці.

Турцыя

Нашу краіну на Першым Міжнародным песенным конкурсе "TurkVision", які пройдзе ў снежні ў турэцкім горадзе Эскішэхір, прадставіць беларуская спявачка Гюнэш. Яна выканае кампазіцыю ўласнага сачынення на турэцкай мове "Son hat ralar..." ("Апошнія ўспаміны"). У форуме возьмуць удзел рэспублікі Цэнтральнай Азіі, Азербайджан, Турцыя і Паўночны Кіпр, Украіна (Крым), Малдова (Гагаузія), Расія (Татарстан, Башкірыя, Чувашыя), Кітай (СУАР), а таксама Грузія, Македонія, Боснія і Герцагавіна.

Польшча

VI Фестываль славянскай паэзіі прайшоў у польскай сталіцы. Пад час мерапрыемства адбылася прэзентацыя Анталогіі беларускай паэзіі на польскай мове, выдадзенай па ініцыятыве галоўнага арганізатара фестывалю Аляксандра Наўроцкага пры падтрымцы Культурнага цэнтра Беларусі. Акрамя таго, прайшло адкрыццё выстаўкі "Гісторыя душы" пра паэму "Дзяды" А.Міцкевіча, падрыхтаванай Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры.

Расія

Дні беларускай культуры прайшлі ў Цюменскай вобласці. Пад час цырымоніі адкрыцця адбылася прэзентацыя кнігі вершаў члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, ганаровага консула Беларусі ў Цюмені Уладзіміра Шуглі "Чацвёртае вымярэнне". Акрамя таго, цягам трох дзён у Цюменскай вобласці праводзіліся літаратурныя праграмы, выстаўкі, адбыўся гала-канцэрт беларускіх майстроў мастацтва.

Гран-пры конкурсу анімацыйных фільмаў X Міжнароднага дабрачыннага кінафестывалю "Прамяністы анёл" атрымала стужка беларускага рэжысёра Тацціяны Кубліцкай "Піліпка". Раней карціна была адзначана прэстыжнымі ўзнагародамі на міжнародных кінафестывалях у чэшскім Зліне, Маскве і Суздалі.

Германія

Дакументальная стужка рэжысёра Віктара Аслюка "Драўляны народ" атрымала Прыз глядацкіх сімпатый у катэгорыі фільмаў працягласцю да 45 хвілін на X Міжнародным кінафестывалі "Filmfest Eberswalde" ў Германіі. Форум праводзіцца з 2004 года і складаецца з некалькіх секцый: кароткаметражнага ігравога, дакументальнага і анімацыйнага кіно.

Латвія

Віцебскі Музей Марка Шагала ў красавіку будучага года адкрые ў Даўгаўпілскім арт-цэнтры імя Марка Роткі выстаўку са сваіх фондаў "Марк Шагал і мастакі еўрапейскага авангарда", якая будзе працаваць цягам трох месяцаў. Акрамя таго, у Віцебску запланавана выстаўка работ сучаснага мастацтва з фондаў Даўгаўпілскага арт-цэнтра імя Марка Роткі.

Падрыхтавала Вольга НАВІЦКАЯ

Фотасюжэт нумара

На крэйдавых азёрах

У Ваўкавыскім раёне ідуць здымкі фільма рэжысёра Віктара Аслюка паводле аповесці Максіма Гарэцкага "Рускі". Фота Уладзіслава МІГДАЛЁНКА

Твор "Рускі" Максіма Гарэцкага прысвечаны падзеям Першай сусветнай вайны. Кнігу пра яе ўдзельнікаў прэзентавалі гэтым тыднем. Падрабязна — на старонцы 14.

Трэба абмеркаваць!

Ці патрэбна гараджанам віртуальная чытальная зала?

За першы тыдзень працы "Мабільнай бібліятэкі" айчыннага аператара сувязі, колькасць наведвальнікаў якой ужо перавысіла 4 700 чалавек, было спампавана звыш 36 000 кніг. Сярод папулярных твораў лідзіруюць "Джэйн Эйр" англійскай пісьменніцы Шарлоты Брантэ і "Віно з дзьмухаўцоў" амерыканскага фантаста Рэя Брэдберы. Далей у рэйтынгу папулярнасці — "Фаўст" Іагана Гётэ, "Партрэт Дарыяна Грэя" Аскара Уайльда, "Вайна светаў" Герберта Уэлса і, што незвычайна, "Адысея" Гамера. Не абмінулі ўвагай і беларускіх аўтараў. Самыя папулярныя, мяркуючы па чытацкай актыўнасці, — "Альпійская балада" Васіля Быкава, "Дзве душы" Максіма Гарэцкага, "Выбраныя творы" Якуба Коласа і "Авантуры Пранціша Вырвіча, шкляра і шпега" Людмілы Рублеўскай.

У топ-спісе — творы як сучаснікаў, так і класікаў (апошніх відавочна больш). Ці мае сэнс віртуальная чытальная зала, прадстаўленая стэндамі на плошчы Якуба Коласа, як сталы праект? Чаму менавіта гэтыя творы набылі найбольшую папулярнасць і чаму сучасная літаратура не апынулася ў лідарах? Па каментарыі мы звярнуліся да асоб, што маюць непасрэднае дачыненне да літаратуры, — абое, дарэчы, выкладчыкі кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ, адказны сакратар часопіса "Нёман", тэатральны крытык:

— Я лічу, што гэта выдатны праект, які набліжае кнігу да чытача, робіць частку культурнай прасторы блізкай сучаснаму гараджаніну, зручнай для яго. Што ж да рэйтынгу, то яго цяжка каментаваць: у спісе не пазначана колькасць запамповак. Дый прычыны, па якіх тая або іншая кніга трапіла ў яго, могуць быць розныя. Можа, мінчане — сапраўды адданыя фанаты Рэя Брэдберы ці Шарлоты Брантэ. А можа, кніга, проста, — сярод абавязковых для прачытання па школьнай ці ўніверсітэцкай вучэбнай праграме (вось я сумняваюся, што шараговы чытач да такой ступені зацікавіўся складаным тэкстам "Адысеі" Гамера). Таму не хацелася б рабіць нейкіх высноў. Проста, здорава, што ты можаш, праходзячы міма, спампаваць патрэбную кнігу, спусціцца ў метро і пачытаць, пакуль будзеш ехаць.

Тое, што айчынныя аўтары трапілі ў спіс, — гэта натуральна. Больш дзіўна было б, калі гэтых імёнаў там не аказалася б. Магчыма, каб правялі гэтую акцыю, нават з тым жа складам кніг, у іншы часавы адрэзак, у лідары мог бы выбіцца нехта іншы, напрыклад, Вячаслаў Адамчык ці Андрэй Мрый.

Што ж да пытання, класіка ці сучасная літаратура, то ў кожнага чалавека павінен быць нейкі баланс паміж імі. Гэта, зноў-такі, праграмнае чытво.

Занатавала Вольга НАВІЦКАЯ

Арцём КАВАЛЕЎСКІ, паэт, перакладчык:

— Калі казаць аб прыведзеным спісе, то "Джэйн Эйр" Шарлоты Брантэ — гэта, па вялікім рахунку, лёгкае забаўляльнае чытво, зразумелае большасці людзей, бо там прысутнічае пачуццёвая прыгода. Ну а Брэдберы, па-першае, — класіка фантастыкі, але не жорсткай, а вельмі гуманістычнай. Гэта тое, што прыцягвае чытача, бо дае магчымасць на пэўны час зазірнуць у іншы свет, распавядае пра звычайнае жыццё, але нібыта ў казачным рэчышчы. "Альпійская балада" Васіля Быкава — безумоўная класіка, нават, лічу, сусветнага маштабу. Зноў жа, гуманістычны сэнс, сцісласць. Праўдзівасць, непадробнасць быкаўскай прозы, шчымлівая, пранікнёная трагічная гісторыя робяць "Альпійскую баладу" такой "хітовай". Мяне, шчыра кажучы, дзівіць, што "Дзве душы" Максіма Гарэцкага — у шэрагу самых папулярных па запампоўцы, таму што, мяркую, мала хто з людзей паспалітых увогуле знаёмы з творчасцю гэтага аўтара.

Наогул, было б добра, каб лідзіравала класіка, але магу сказаць, што чытаюць і іншае. Такая літаратура павінна быць запатрабаванай, але з беларускай класікай пытанне паўстае цяжэй. Ды добра, што існуе пэўны працэнт людзей, якія чытаюць па-беларуску і любяць беларускую мову.

У літаратуры павінна быць усё: і забаўляльнае, і лёгкае, і сур'ёзнае, і глыбокае, і філасофскае. Але тое, што выбірае чытач — гэта ўжо ягоныя прэферэнцыі, якія залежаць ад узроўню адукацыі, ад светапогляду. Галоўнае, каб людзі чыталі, бо апошнім часам усе сталі "пісьменнікамі": кожны сядзіць у сацыяльных сетках, піша свой блог, а чытаць ужо няма каму.

Паэзію ж, здаецца, чытаюць мала. З іншага боку, калі ў 1960-я гады паэты збіралі стадыёны — гэта таксама нонсэнс быў. Урэшце, паэзія — гэта для абраных, яе трэба адчуваць не толькі галавой, сэрцам, але і нават хрыбетнікам. Для паэта важна разумець: калі ў цябе ёсць пэўнае кола чытачоў — гэта ўжо добра, і значыць, што літаратура пішацца не ў стол, а ў свет.

Безумоўна, ідэя стварэння віртуальнай чытальнай залы — вельмі добрая. Лічу, што чым больш будзе такіх "маякоў", якія заахвочваюць увогуле звяртацца да чытання, — тым лепш. Падобныя праекты трэба вітаць і надалей працягваць, нават у выглядзе падобнага "атракцыёну".

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце
на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77,
альбо на электронную скрыню kultura@tut.by,
тэлефануйце
ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97,
абмяркоўвайце
на www.facebook.com/kimpressby,
www.vk.com/kimpressby, www.twitter.com/kultura_by!

Увага! Аб'ява!*

ДВОРЕЦ РЕСПУБЛИКИ
объявляет конкурс
на замещение вакантных должностей в Президентский оркестр Республики Беларусь:

— артист эстрадно-симфонического оркестра:
виолончель — 1 чел., фортепиано — 1 чел.

Срок подачи заявок и документов — до 07.12.2013,
по адресу: 220030, г. Минск, Октябрьская пл., д. 1 — 1.
К заявлению прилагать документы, предусмотренные Инструкцией о порядке проведения конкурса, утвержденной Министерством культуры Республики Беларусь от 22.01.2009 № 3.
Для резюме: факс: 229-91-84; email: dirork@yandex.ru
Дополнительная информация — по телефонам: 229-90-50, 229-90-08, 229-90-04.

Дзяжурны па нумары

Глянцавы Эйяф'ядлаёкюдль

Ілья СВІРЫН,
рэдактар аддзела газеты "Культура"

Пішучы пра адну бліскучую імпрэзу, што прайшла ў маляўнічым беларускім раёне, ніводнага разу не ўжыў у артыкуле яе афіцыйную назву. Зрабіў гэта свядома: незгаданы мной узор "нэймінгу" (выказнік-азначэнне-дзейнік-дапаўненне) можна запомніць хіба раза з дзясятага. Не раўнуючы бы назву ісландскага вулкана Эйяф'ядлаёкюдль, які не так даўно ўсім учыніў клопату.

— Гэта як есці слана, — вучыў мяне некалі знаёмец з Ісландыі, — Трэба вымаўляць па складах: Эй-я-ф'я-длу... Ой, усё адно збіўся...

З фэсту я вярнуўся не з пустымі рукамі, але з пакункам сувеніраў, якія ўручалі ўсім гасцям. Асаблівую вагу ў ім меў шыкоўны прэзентацыйны фотаальбом, прысвечаны таму краю. Пагартаў яго — і здзівіўся. Здавалася б, глянец пакліканы пераўвасабляць "шурпатую" рэчаіснасць у ідэал: насамрэч ногі мадэлі крывыя, а на фота яны стромкія бы бярозкі. Але тут — супрацьлеглы выпадак.

Нязначную частку альбома займаюць здымкі тых самых бярозак ды іншай прыроды (іх рабіў адзіны заангажаваны ў праект прафесіянал) ды архітэктурных помнікаў (не горш і не лепш, чым у блогах аматараў). Але большасць старонак чамусьці аддадзена менавіта пад дакументацыю сучаснага побыту — стэрыльную і паталагічна датклівую. Вось чыгуначная станцыя, вось электрычка на заднім плане... На пярэднім — чамусьці сметніца. Вось крама, абліцаваная пліткай а-ля "кабанчык". Вось паліцы крамы, на якіх стаіць той самы гатунак распушчальнай кавы, што можна сустрэць і ў Берліне, і ў Мумбаі. Вось прахадная завода, якая выглядае дакладна так, як і павінна выглядаць прахадная. Знята добрасумлена, гарызонт не завалены — у адрозненне, дарэчы, ад фота на вокладцы...

У звязку з гэтым, у старонняга адразу ўзнікае пытанне: што вы мне гэтым хацелі сказаць? Што ў вас ёсць сметніцы, плітка-"кабанчык" ды распушчальная кава? Дзякуй за інфармацыю... Адсюль і пытанні. Першае: навошта было змарнавана столькі добрай глянцавай паперы? І другое: калі такія альбомы робяцца хіба раз на дзесяцігоддзе, няўжо нельга парупіцца, каб іх змест быў... ну хаця б адпаведным паліграфіі?

Большасць прэзентацыйных альбомаў у рэгіёнах чамусьці аддадзена пад дакументацыю сучаснага побыту: вось чыгуначная станцыя, вось электрычка на заднім плане... На пярэднім — чамусьці сметніца. Вось крама, абліцаваная пліткай а-ля "кабанчык", вось прахадная завода...

Другое пытанне — рытарычнае. Ездзячы ў камандзіроўкі з Юрыем Івановым, заўсёды здзіўляўся, як ён выбудоўвае кадр, спалучаючы і фатографа, і рэжысёра, і псіхолага... Хаця, здавалася б, робіць толькі газетнае фота, у паласу з якім заўтра могуць загарнуць селядзец... Але халтурыць прафесіяналы не ўмеюць. І такія прафесіяналы ў нас ёсць — вядома, маю на ўвазе не толькі свайго калегу. Ды, на жаль, замоўцы рупяцца адно пра шыкоўную паліграфію... Адказ на пытанне "Навошта рабілі?" — відавочны. Беларускамоўныя тэксты альбома прадубліраваны па-англійску (няхай і з памылкай у самім напісанні райцэнтра, назва якога чамусьці транслітаравана з рускай). Толькі, здаецца, дарма стараліся перакладчыкі...

Магу сабе ўявіць, што сказаў бы той самы знаёмец з Ісландыі, прагледзеўшы гэтыя здымкі, дзе пабачыш і сцены, і дамы, і тэхніку, але толькі не людзей. "Oh, Belarus, Chernobyl... I do understand...". Я, вядома, адразу б запярэчыў: ды пры чым тут вашы стэрэатыпы ў дачыненні да гэтага краю? Азёры там — чыстыя, лясы — зялёныя, малачко з-пад каровы — зусім не хімія, што ў супермаркетах... Адным словам — зямны рай, параўнальна з тваёй суровай выспай.

— А людзі? — спытае ён мяне. — А людзі дзе?

І сапраўды, на большасці фота людзей не відаць. Ёсць дзяржустановы, прадпрыемствы, школы, бальніцы, дамы культуры, а людзей — амаль няма. Хіба дзесьці на ўскрайку кадра, дый тое — патыліцы. Нібыта яны ўцякаюць ад камеры.

— Ды кінь ты гэтую кніжку ў свой Эйяф'ядлаёкюдль! — не стрываўшы, параю я тады. — Паехалі ў той край, і на свае вочы ўбачыш там усебакова прыгожых людзей, якія і ў госці цябе прымуць, і песню прыгожую спяюць, і малачка з-пад каровы нальюць — ды і не толькі малачка, калі пажадаеш…

...Толькі вось, ці паедзе?

Вось-вось

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1.)

...Кажуць, усё пачалося з навальніцы, якая паваліла на дах дрэва. Напачатку прабоіна была невялічкай, але, згодна з усімі законамі фізікі, яна стала імкліва шырыцца ў памерах. Гонта струхлела, гніль паступова ахоплівае ўжо і мажныя кроквы… Дакрануўшыся рукой да "аголенай" кладкі, адчуваеш, як рарытэтная цэгла-пальчатка проста трушчыцца ў друз, слой за слоем. І вось, будынак, які прастаяў больш за тры стагоддзі, пераўтварыўся амаль у руіну — літаральна за лічаныя гады!

Адпаведна, нават не паўставала пытання, з чаго пачынаць "воз працы". Мэты сёлетняй талакі былі сціплыя: першасныя меры па кансервацыі "мураванкі", якія дазволяць ёй перажыць зіму. Такія захады трапляюць у катэгорыю супрацьаварыйных работ і не патрабуюць удзелу спецыялістаў у галіне рэстаўрацыі і дазволу Міністэрства культуры краіны. Толькі — чыёйсьці ініцыятывы: прыйшоў ды рабі!

Праца пачалася з расчысткі даху ад гнілля: яно, як вядома, мае біялагічную ўласцівасць множыцца і спрыяць далейшаму руйнаванню. І, да таго ж, уяўляе небяспеку для цікаўных наведвальнікаў. Варта было толькі дакрануцца да некаторых кавалкаў шыферу, як яны самі ахвотна валіліся долу…

Нашымі намаганнямі на даху была ўстаноўлена вялізная "латка" з дошак і рубероіду. Матэрыялы, вядома, — не самыя трывалыя, але калі "Хаўер" ізноў не здарыцца, да вясны гэтая канструкцыя дакладна пратрывае. Балазе рабілася ўсё максімальна грунтоўна: для часовай кансервацыі.

Яшчэ больш сур'ёзная канструкцыя была ўсталявана па-над тым рэдкім аб'ектам з "арэалу Рэйтанаў", што знаходзіцца за межамі Грушаўкі: капліччкай на ляхавіцкіх могілках. Здаецца, яе "брыль" ужо амаль вісіць у паветры і вось-вось абрынецца: настолькі моцная эрозія кладкі апорных калон... Зміцер Юркевіч і энтузіясты з саміх Ляхавічаў Ігар Гавіна ды Алег Балаш пакрылі яе часовым дахам — насцілам з дошак. Выгляд, канешне ж, ужо не той рамантычны, як быў раней (напаўзруйнаваную капліцу на пагосце бачыў не раўнуючы кожны, хто прыязджаў у гарадок), але ейныя шанцы дажыць да вясны істотна павялічыліся.

Дазвол на правядзенне работ у дадзеным выпадку таксама не быў патрэбны: адна з нешматлікіх ляхавіцкіх згадак пра Рэйтанаў, якія зрабілі для гарадка вельмі шмат, на сёння не мае статуса каштоўнасці.

...Цалкам можа здарыцца, што нашчадкі пашкадуюць пра нашу нядбайнасць: сёння вунь аднаўляюць з нуля страчаныя помнікі. І таму гісторыя "мураванкі" мусіць стаць павучальным урокам, асабліва ў Год беражлівасці.

Лёс камяніцы магла паўтарыць і колішняя спіртоўня, на даху якой таксама ўтварылася невялікая (пакуль) дзірка. Удзельнікі талакі "зацыравалі" яе такім самым спосабам. Але чытачы нашага грушаўскага "серыяла" памятаюць, што зрабіць гэтую нескладаную работу яшчэ ўвесну абяцалі "адказныя асобы" з тагачаснага яшчэ аддзела культуры.

"Прадсядацель дык прадсядацель!"

Паступова вакол сядзібы ў Грушаўцы выбудоўваецца кола неабыякавых людзей — няхай сабе пакуль і невялікае. Напрыклад, Уладзімір Варанец — прафесійны рэстаўратар будаўнічай спецыяльнасці. Родам ён з тых мясцін і даўно марыць пра іх адраджэнне. Гэтым разам выступіў у ролі прараба, кіруючы стварэннем канструкцыі часовага даху з дошак і рубероіду.

Сярод актыўных удзельнікаў талакі быў і старшыня Начаўскага сельвыканкама (Грушаўка да яго прыналежыць) Вячаслаў Новік. Прычым удзел гэты быў зусім не намінальны. Ужо немалады, але рухавы мужчына шпарка караскаўся па драбінах з трохметровай дошкай пад пахай і адважна балансаваў на хісткім карнізе. Мне, куды маладзейшаму, было ажно сорамна!

Чарговы суботнік у Грушаўцы праходзіў з імправізаваным канцэртам.

Юрыдычныя тонкасці: скарачэнне колькасці

Рэспубліканскі семінар "Актуальныя пытанні прымянення заканадаўства ва ўстановах культуры", што прайшоў 31 кастрычніка ў зале калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, быў прысвечаны, у прыватнасці, пытанням прававога рэгулявання скарачэння колькасці або штату работнікаў ва ўстановах, падпарадкаваных Міністэрству культуры. Менавіта на названых аспектах сакцэнтавана ўвага ў аглядзе мерапрыемства, падрыхтаваным і прадастаўленым "К" Інстытутам культуры Беларусі.

Асноўная частка семінара была адведзена практычнаму прымяненню нормаў Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12 красавіка 2013 г. № 168 "Аб некаторых мерах па аптымізацыі сістэмы дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый, а таксама колькасці іх работнікаў". Як адзначыла кансультант аддзела працоўнага заканадаўства юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай аховы Беларусі Таццяна Рахуба, згодна з дадзеным Указам, скарачэнню падлягаюць толькі тыя работнікі арганізацый культуры, дзейнасць якіх фінансуецца за кошт сродкаў бюджэту. Пры арганізацыях, падпарадкаваных Міністэрству культуры, існуюць падраздзяленні, што фінансуюцца за кошт іншых сродкаў ці знаходзяцца на гаспадарчым разліку. Работнікі гэтых падраздзяленняў не падлягаюць скарачэнню, паколькі гэта супярэчыць нормам Указа № 168, якія носяць імператыўны характар.

Калі пры ліквідацыі арганізацыі звальненню падлягаюць усе работнікі, без выключэння, то пры скарачэнні колькасці або штату работнікаў скасаванне працоўных дагавораў закранае толькі асобных работнікаў.

Першымі крокамі з'яўляюцца прыняцце рашэння аб скарачэнні, вызначэнне мерапрыемстваў па яго рэалізацыі, адказных асоб і замацаванне гэтага ў загадзе. Загад складаецца ў адвольнай форме. У ім адзначаецца, якія пасады і якая колькасць штатных адзінак падлягаюць скарачэнню. Адначасова падаецца і спіс тых работнікаў, што не падлягаюць скарачэнню.

Згодна з артыкулам 45 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, пры роўнай прадукцыйнасці працы і кваліфікацыі наймальнік абавязаны аддаваць перавагу наступным катэгорыям работнікаў: удзельнікам ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС; тым, хто захварэў ці перанёс прамянёвую хваробу, выкліканую наступствамі катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый; інвалідам і іншым катэгорыям работнікаў, якія прадугледжаны заканадаўствам, калектыўным дагаворам, пагадненнем.

Акрамя таго, пераважнае права пры іншых роўных умовах пры скарачэнні колькасці або штату работнікаў прадастаўляецца: ветэранам баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў (арт. 18 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб ветэранах"), асобам, абраным у склад прафсаюзных органаў (арт. 24 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб прафесійных саюзах"), жонкам вайскоўцаў і членам сем'яў ваеннаслужачых, якія загінулі пры выкананні воінскага абавязку (арт. 24 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб статусе ваеннаслужачых").

Згодна з артыкулам 268 Працоўнага кодэкса, скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка з цяжарнымі жанчынамі, жанчынамі, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў, адзінокімі маці, якія маюць дзяцей ва ўзросце ад 3 да 14 гадоў (дзяцей-інвалідаў — да 18 гадоў), не дапускаецца, акрамя выпадкаў ліквідацыі арганізацыі, а таксама на падставах, прадугледжа-

абрынецца. Ці не?

Як пачаць "Зваротны адлік" для сядзібы ў Грушаўцы, а не проста зацыраваць дзіры

Вячаслаў Аляксандравіч і сапраўды ўжо мае пенсійны век. Усё жыццё адпрацаваў у праваахоўных структурах. Ды і пасаду старшыні сельвыканкама не назаве сінекурай ніхто і нідзе: клопатаў — поўны кош, а магчымасцей ды паўнамоцтваў — кот наплакаў... Тым не менш, ён ахвяраваў на суботнік увесь свой выхадны, без "перакураў" і нават абеду!

Увесь час думаў задаць яму пытанне: чаму і навошта? Але за цэлы дзень так і не наважыўся. Бо цалкам зразумела, што ў дадзеным выпадку яно было рытарычным. Як гэта навошта? На нашай зямлі знаходзіцца такая адметнасць — дык каму, як не нам, належыць яе ратаваць?

— Гэта ж той самы дом, у якім жыў сам Тадэвуш Рэйтэн! — з "прыдыханнем" кажа ён пра лядашчую "мураванку".

Старшыня мясцовай гаспадаркі, які таксама прыехаў "на шумок", такі піетэт не падзяляе — мяркуючы, прынамсі, па выразе ягонага твару. Маўляў, што тут за хараство такое... Відавочна, пазіцыі дзвюх галін "улады на месцах" па гэтым пытанні не супадаюць, што, на жаль, — характэрны выпадак. Прыкладам, гады тры таму ў Камянецкім раёне адбылася цікавая калізія: старшыня сельвыканкама ініцыявала наданне сядзібнаму комплексу статуса каштоўнасці, а старшыня гаспадаркі, дачуўшыся пра тое, хуценька знёс адну з яго частак — пакуль не прыйшлі дакументы...

Каб парукацца з калегам, Вячаславу Аляксандравічу давялося спускацца з карніза "мураванкі" па драбінах. Ён не стаў ні ў чым пераконваць суразмоўцу — адно папрасіў трактар з прычэпам, каб пагрузіць на яго ўсё зрынутае з даху гніллё. І старшыня СВК не адмовіў.

Прыкладна так пакуль і вырашаюцца пытанні ў Грушаўцы: я папрасіў, ну а ты ж — зямляк... Вось і ляхавіцкія пажарнікі аказалі "спонсарскую дапамогу" ў выглядзе высокіх драбін і спецтранспарту для яе дастаўкі. Вячаслаў Новік марыць: нам бы яшчэ аўтавышку! Але тут жа дадае: ніхто яе ў раёне задарма не дасць.

Многія начальнікі самага рознага ўзроўню лічаць, што дыстанцыю паміж імі ды "простым людам" належыць усяляк падкрэсліваць. Выглядаць паважна, насіць гальштук і "дыпламат"... Але прыклад Вячаслава Аляксандравіча сведчыць за тое, што рэпутацыю трэба здабываць зусім іншым спосабам.

— Вой, ты глядзі, гэта ж сам Новік там робіць! — перагаворваліся цікаўныя грушаўскія бабулі. — Ну, я табе кажу, гэта ён! Упершыню такое бачу. Во гэта прадсядацель дык прадсядацель!..

На жаль, іхнія дзеці ў той самы час займаліся нечым іншым.

Арт-дырэктар суботніка

Папрацаваўшы ў Грушаўцы з ранку да вечара, можна было паназіраць за тым, як праходзіць дзень жыцця закінутай сядзібы. Машыны пад'язджалі да яе не радзей чым раз на гадзіну — і свае, ляхавіцкія, і з мінскімі нумарамі. Завітала група веласіпедзістаў — пад час чарговай "пакатушкі" з гісторыка-культурным ухілам. Прыехалі тэлевізійшчыкі ў пошуку цікавых сюжэтаў... Дзятва гуляла ў палацы ў хованкі. Адным словам, сядзіба — жыве. Проста пазабіваць яе вокны і дзверы — гэта паўмера. Прычым, як сведчыць досвед, часовая. Вельмі часовая: хіба на пару тыдняў. Бо тут яўна патрэбна нешта большае.

Самы цікавы эпізод — гэта імправізаваны канцэрт ля той самай "мураванкі". Нешматлікая мясцовая публіка слухала прывезены з Мінска акардэон, у той самы час як працоўная група пад гэтыя чароўныя гукі стукала малаткамі: светлавы дзень гэтай парой надта кароткі, і тое не дазваляе рабіць хоць якія паўзы.

Ролю арт-дырэктара суботніка ўзяла на сябе легендарная ў сталічных колах асоба, вядомая пад імем Алена Генадзьеўна, якой даўно ўжо пара ўручыць прыз "Лепшы глядач": рэдка якую вартую ўвагі імпрэзу ў Мінску яна прапускае. Дзякуючы ейнаму імпэту ў мінулыя выхадныя непасрэдна ў "мураванцы" адбыўся канцэрт маладой зоркі бардаўскай песні Паліны Рэспублікі. Але куды важней тое, што мясцовая дзятва добра навучылася танчыць паланэзы. Алену Генадзьеўну дзятва ў Грушаўцы заўсёды чакае!

Іншая руплівіца — баранавіцкая мастачка Святлана Бадак — здолела заахвоціць малых прыбраць смецце з палаца ды яго ваколіц. Набілася шэсць-сем вялікіх пакетаў! Адпаведна, ключ да сэрца мясцовых жыхароў ужо знойдзены.

— Скажыце, а яшчэ канцэрт будзе? — сціпла запытвалі дзецюкі, праходзячы міма. — А вось той фестываль, што быў улетку, ці пройдзе ў наступным годзе?..

■■■

Зміцер Юркевіч перакананы ў тым, што працяг будзе. Ён ужо плануе цэлую праграму разнастайных мерапрыемстваў на наступны год — пасля таго, як растане снег, які на тэрыторыі сядзібы, вядома ж, ніхто не прыбірае. Галоўная задача — зрабіць стацыянарны дах для "мураванкі" з дапамогай архітэктараў-валанцёраў. А таксама прадоўжыць высілкі па папулярызацыі роду Рэйтэнаў.

Хочацца спадзявацца, што чысты энтузіязм займее таксама і нейкае юрыдычнае вымярэнне — скажам, у выглядзе дабрачыннага фонду, як тое ўжо здарылася ў Любчы ды Крэве. Але яшчэ больш хочацца спадзявацца на актыўнейшую падтрымку гэтых пачынаў з боку раённых улад — хаця б нават на ўзроўні аўтавышкі і матэрыялаў. Бо пакуль што дошкі ды рубероід энтузіясты куплялі за свае кроўныя.

Урэшце, і яшчэ адзін вынік года. У згаданым артыкуле Зміцер Юркевіч пісаў пра тое, што постаць Тадэвуша Рэйтэна забытая нашымі сучаснікамі. На шчасце, цяпер гэта ўжо не так — пасля нядаўняга эфіру тэлефільма з цыкла "Зваротны адлік", які паглядзелі мільёны гледачоў. Кіно, як кажуць, атрымалася, ды і сам праект, бясспрэчна, — выдатны. Вось толькі, лакацыі, у якіх адбываліся гістарычныя пастаноўкі, былі, на жаль, да болю пазнавальнымі, нягледзячы на ўсе старанні рэжысёра: Мірскі замак, Лошыцкая сядзіба... У цяперашняй Грушаўцы "XVIII стагоддзе" не здымеш — як і ў большасці іншых маёнткаў.

Ствараючы перспектыўны план адраджэння сядзібы Рэйтэнаў, Зміцер Юркевіч прывёў цэлы спіс яе магчымых новых функцый. Адна з іх — менавіта пляцоўка для здымак гістарычнага кіно. А што, і праўда: экранізаваць таго ж Караткевіча за межамі Беларусі ў часы незалежнасці будзе ўжо проста сорамна.

Ілья СВІРЫН,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Ляхавіцкі раён — Мінск

або штату работнікаў

ных пп. 4, 5, 7, 8 і 9 арт. 42 і пп. 1 — 3 арт. 47 Працоўнага кодэкса. Такім чынам, паколькі звальненне па скарачэнні колькасці або штату работнікаў з'яўляецца падставай для звальнення па ініцыятыве наймальніка, то скасаванне працоўнага дагавора з вышэйпералічанымі катэгорыямі работнікаў не дапускаецца.

Адначасова неабходна памятаць, што, згодна з артыкулам 271 Працоўнага кодэкса, працуючым бацькам, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе за дзіцем замест маці, прадастаўляюцца гарантыі, прадугледжаныя часткай трэцяй артыкула 268 Працоўнага кодэкса.

Акрамя таго, наймальнік абавязаны не пазней чым за два месяцы да звальнення, калі больш працяглыя тэрміны не прадугледжаны ў калектыўным дагаворы ці пагадненні, пісьмова папярэдзіць аб гэтым работніка, пасада якога скарачаецца.

Не менш чым за два месяцы да такога вызвалення наймальнік абавязаны пісьмова паведаміць аб гэтым у мясцовыя органы занятасці і не пазней чым за два тыдні папярэдзіць прафсаюз.

Пры скарачэнні колькасці або штату работнікаў наймальнік мае права ў межах аднародных прафесій і пасад правесці перастаноўку работнікаў і перавесці больш кваліфікаванага работніка, пасада якога скарачаецца, з яго згоды на іншую пасаду, звольніўшы з яе па п. 1 арт. 42 Працоўнага кодэкса менш кваліфікаванага работніка.

Скасаванне працоўнага дагавора пры скарачэнні колькасці або штату работнікаў дапускаецца толькі тады, калі немагчыма перавесці работніка з яго згоды на іншую працу. Такая норма ўтрымліваецца ў артыкуле 43 Працоўнага кодэкса. Пры скарачэнні колькасці або штату работнікаў наймальнік павінен прапаноўваць усю наяўную ў яго працу, як адпаведную роду дзейнасці работніка, так і іншую, якую той можа выконваць з улікам кваліфікацыі ды практычных навыкаў, у тым ліку і некваліфікаваную.

Разам з тым, адзначыла Т.Рахуба, у перыяд тэрміну папярэджання работнік павінен выконваць свае працоўныя абавязкі, падпарадкоўвацца правілам унутранага працоўнага распарадку, яму гарантуюцца ўмовы і аплата працы нароўні з іншымі работнікамі.

У перыяд тэрміну папярэджання работніку прадастаўляецца адзін свабодны дзень у тыдзень без захавання заработнай платы (па дамоўленасці з наймальнікам — з захаваннем) для вырашэння пытання аб самастойным працаўладкаванні ў іншых наймальнікаў.

Наймальнік мае права са згоды работніка замяніць папярэджанне аб маючым адбыцца звальненні выплатай кампенсацыі ў памеры двухмесячнага сярэдняга заробку. Пры гэтым, калі ініцыятыва ў дасягненні такога пагаднення зыходзіць ад наймальніка пасля папярэджання работніка аб маючым адбыцца вызваленні, кампенсацыя выплачваецца прапарцыянальна часу, які застаўся да заканчэння двухмесячнага тэрміну папярэджання.Па заканчэнні двух месяцаў пасля ўручэння паведамлення аб звальненні наймальнік мае права выдаць загад аб звальненні работніка. Аднак звальненне пры скарачэнні штату будзе законным толькі ў тым выпадку, калі немагчыма перавесці работніка з яго згоды на іншую працу, у тым ліку з перанавучаннем, альбо калі работнік адмовіўся ад пераводу.

У апошні дзень тэрміну папярэджання наймальнік абавязаны выдаць работніку працоўную кніжку і выплаціць усе сумы грошай, якія яму належаць (у памеры не менш трохразовага сярэднямесячнага заробку).

Падрыхтаваў Раман ХАРЫТОНЧЫК,
супрацоўнік аддзела навукова-метадычнага забеспячэння інавацыйнага развіцця сферы культуры Інстытута культуры Беларусі

Працяг тэмы — у бліжэйшых нумарах.

На маю думку...

Культура... кавы. Не расчаруем?

Таша ЛАПАЦЕНКА,
антраполаг гастранаміі,
ганаровы сябра і дарадца
Гільдыі шэф-кухараў Беларусі

Для мяне кава ўжо даўно перастала быць проста напоем. Цяпер гэта адзін з кампанентаў зносін, яшчэ адна магчымасць даведацца пра чалавека ці пра месца, у якое прывёў мяне лёс заўзятага вандроўніка. Культурны складнік, калі жадаеце. "Ты хочаш ведаць, што гэта за месца? — пытаўся ў мяне добры знаёмы і, па сумяшчальніцтве, вядомы рэстаранны аглядальнік. — Замаўляй каву, прычым твой заказ павінен быць складаным ды імклівым. Што б ты ні выбрала, каву прасі адразу ж, і калі яны яе гатаваць не ўмеюць ці не любяць, дык і ежу ты атрымаеш прыблізна такую ж".

Неяк так павялося, даўно ўжо, што мае ўспаміны пра гарады, у якіх давялося пабываць, іх успрыняцце непарыўна звязаны з кавай, харчовымі рынкамі і вулічнай ежай. Прычым калі ў якім-небудзь горадзе каву гатаваць не ўмеюць ці не любяць, дык і горад сам па сабе аказваецца не вельмі цікавым, а то і шчыра сумным… А што ж Мінск? Ці здзівім хакейных заўзятараў праз якія паўгода? Або хаця б не расчаруем?

Добра чалавеку, у горадзе якога кава варыцца на кожным куце, дзе кожная кавярня здольная дагадзіць табе, пачынаючы ад смаку ды заканчваючы правільнай пенкай. Але калі ў цябе няма магчымасці атрымліваць асалоду ад добрай кавы, дык, па меншай меры, заўсёды застаецца шанц знайсці адносна прымальны варыянт за ўмераныя грошы.

Ды вось праблема: у сістэмы грамадскага харчавання нашай сталіцы — своеасаблівая логіка. І свой лёс. Прычым, каб зразумець гэта, вам хопіць некалькіх візітаў у гарадскія кавярні. Прынамсі, мне хапіла.

Можа, наш уласны шлях у суровы свет гастранаміі павінен пачацца з умення галасаваць рублём? Што скажаце?

…Тым летнім вечарам я доўга распавядала сябрам гісторыю адной з самых вядомых кавярняў на планеце, размахвала рукамі, прыводзіла факты і цытавала рэцэпты. "Навошта распавядаць, калі можна дапамагчы выбраць, — сказалі мне. — Тут непадалёк, па лініі метро, ёсць невялікая кавярня з падобным асартыментам. Паехалі!"

Пасля візіту ў тую кавярню мне падумалася (хаця пытанне, вядома, рытарычнае): навошта пісаць назву кавы, якую ты дакладна не ведаеш, як гатаваць? Фрапучына. Што можа быць прасцей? Насыпаў у блэндар лёду пабольш, дадаў каву, вяршкі, смачнага сіропа, здрабіў. На выхадзе мы атрымліваем густую салодкую субстанцыю, якую можна смела абмешваць збітымі вяршкамі і паліваць карамельным, напрыклад, соусам. Але дзяўчыне-барыста, відаць, адкрыліся новыя гарызонты, бо замест чаканага і завочна любімага напою мы атрымалі… кававае малако, злёгку цёплае і надзіва нясмачнае. І вось што рабіць з гэтым? Адмаўляцца, патрабаваць перарабіць, распавядаць, як трэба, ці проста папрасіць дазволу зрабіць усё самой? Няўжо з усіх, хто яго замаўляў, толькі я ведаю, як тое фрапучына выглядае?..

Мы бяромся казаць пра тонкасці прасмажвання стэйка, ладзім пафасныя конкурсы кухараў, у тым ліку па тэлебачанні, пішам артыкулы і літаральна вылузваемся са скуры, намагаючыся сказаць, няхай і не заўсёды дарэчнае, але сваё роднае слова ў свеце гастранаміі. Разносячы ў пух і прах няякасныя стравы і агідны сэрвіс, мы забываемся на тое, што праўда не ў тым, хто грамчэй крыкне прапісную ісціну, а ў тым, хто навучыцца ветліва, ды цвёрда вяртаць тое, што не падабаецца ці дрэнна прыгатавана. Можа, наш уласны шлях у суровы свет гастранаміі павінен пачацца з умення галасаваць рублём? Што скажаце?

Культавы рэжысёр — пра кіно і "Вечнае вяртанне"

Культавы рэжысёр Кіра МУРАТАВА, якая прыехала на Мінскі міжнародны кінафестываль, каб прадставіць сваю карціну "Вечнае вяртанне", стала на "Лістападзе-2013" госцем, якога чакалі надзвычайна. "ЯНА прыйшла на карціну "Інтымныя месцы"; "ЯНА сышла з паказу Клэр Дэні"; "ЯНА незадаволена пытаннямі журналістаў...", — вакол Кіры Георгіеўны віравала воблака легенды, і сказаць, што сустрэцца, пагутарыць з кінарэжысёрам хацелі ўсе, — напэўна, не сказаць нічога. Вядома, што Кіра Муратава не любіць мець стасункі з прэсай да дэманстрацыі сваёй карціны (увогуле не любіць даваць інтэрв'ю). Сёлета ж сітуацыя ўскладнілася яшчэ і тым, што Кіра Георгіеўна прыхварэла. У выніку — зносіны з СМІ апынуліся пад пытаннем, настрой легенды кіно псаваўся, але, у рэшце рэшт, ЯНА знайшла час для адказу на пытанні журналістаў і публікі.

Кіра МУРАТАВА: "Усё паўтараецца"

Колькі слоў пра карціну майстра. "Вечнае вяртаннне" — гэта бясконцыя і вынаходлівыя варыянты аповеду аднаго сюжэта. Аднакурснік завітвае да аднакурсніцы з просьбай параіць яму штосьці ў складанай жыццёвай сітуацыі. Ён закахаўся, і не можа выбраць: ці яму застацца з жонкай, ці сысці да каханкі. Мужчына пакутуе, пытаецца, турбуе каляжанку, усе адказы яму не падабаюцца, ён сыходзіць і... зноў вяртаецца.

Сітуацыя, у якой апынуўся герой, актуальная ва ўсе часы: яна здараецца з людзьмі розных узростаў і характараў. Менавіта гэтую прадказальнасць чалавечай натуры вылучае і абыгрывае аўтар, адмысловым чынам распавядаючы дылему героя некалькі разоў. У выкананні любімых акцёраў Кіры Муратавай — Георгія Дзяліева, Наталлі Бузько, Алы Дзямідавай, Алега Табакова, Рэнаты Літвінавай, Сяргея Макавецкага — гісторыя "бясконца" паўтараецца: у кожнай пары — на свой лад, але з аднолькавым тэкстам. Па сутнасці, гэта вечнае вяртанне "знаёмай тэмы" — і немагчымасць яе вырашэння. Гэта чалавечая прырода, якая не песціць нас сваёй дасканаласцю.

Гісторыя стварэння карціны

— Насамрэч, на самым пачатку гэта мусіў быць кінаальманах. Пяць кінанавел, якія мы хацелі здымаць: дзве — мае, і тры — іншых аўтараў. Але прадзюсар сказаў, што гэта вельмі дорага і, увогуле, кінаальманахі сёння не ў модзе. Зрухаў не назіралася. Тады і з'явілася думка з дапамогай паўтораў зрабіць з маёй навелы поўнаметражны сцэнарый. Напрыканцы яго я дапісала: папярэдні тэкст тройчы паўтараецца трыма парамі акцёраў — мужчынам і жанчынай. І мы запусціліся.

Калі пачаўся падрыхтоўчы перыяд карціны і рэпетыцыі, узнікла ўсё ж больш, чым тры пары. Хтосьці ў гэтым працэсе адсейваўся, хтосьці ўзнікаў, але мне спадабалася шмат варыянтаў, і ў выніку засталося сем пар. Яшчэ нарадзіліся і дадатковыя сцэны. Спачатку іх было дзве, але падумалася: герой — ён жа такі зануда, ён увесь час будзе вяртацца. І ўзнікла яшчэ адна сцэна, а потым я напісала яшчэ адну. У выніку вышлі на чатыры "вяртанні".

Пра рэпетыцыі і малабюджэтны кінематограф

— Рэпеціравалі мы доўга: каля чатырох месяцаў. Падрабязна. Прадзюсар быў упэўнены, што будзем выкарыстоўваць гэтыя пробы. І потым здзівіўся, што патрэбна камера нармальная, дэкарацыі, трэба ўсё фіксаваць наноў. Але за гэты час ён ужо трохі прызвычаіўся і ўцягнуўся.

Над дэкарацыямі ў карціне працаваў Яўген (Яўген Галубенка — мастак, сцэнарыст, муж Кіры Муратавай, які, дарэчы, суправаджаў яе на "Лістападзе-2013". — **Д.А.**). Атрымалася, што гаспадынь у нас было больш, чым інтэр'ераў, і тут магла дапагчы толькі пэўная трансфармацыя пакояў. Як можна гэта зрабіць пры абмежаванасці сродкаў? Вядома, з дапамогай мастацкага афармлення. І ўсе тыя дэкаратыўныя аб'екты, работы, што вы бачыце ў інтэр'ерах, Яўген зрабіў сам.

У цэлым, гэта і называецца малабюджэтным кінематографам.

Пра галоўнага героя

— "Галоўны герой" гэтай карціны, насамрэч, — мантаж. Калі пачалі праглядаць зняты матэрыял, мы сталі выразаць самае цікавае ў кожнай пары, рытмічна гэта выкладваць, перастаўляць. Мантаж — гэта драматургія кадра, а драматургія — гэта мантаж слоў. Больш за ўсё гэта мяне і цікавіла ў стужцы. І сталася тут маім захапленнем.

У "Вечным вяртанні" форма становіцца зместам. Стужка так сканцэптуалізавана, "пашыта", што яе форму, кампазіцыю нельга адарваць ад зместу. Ведаеце, у Яўгена ёсць такі цыкл калажаў. Вы маглі іх бачыць у фільме, работы вісяць у дэкарацыях: рамкі розных форм — круглыя, квадратныя... Унутры адной рамкі — гэткая ж па форме, толькі меншая, і яшчэ адна, і яшчэ... Адбываецца такая гульня. Так і мой фільм чымсьці перагукаецца з гэтым творам. У рэшце рэшт, што такое рамка? Здаецца — другасная форма, але гэта не так. І яна можа стаць зместам. Мне дадзеная ідэя вельмі даспадобы, бо яна ілюструе штосьці вельмі глыбокае пра мастацтва.

Адно і тое ж

— Чаму фільм мае назву "Вечнае вяртанне"? Гэтае выслоўе выкарыстоўвалі не толькі Ніцшэ ці Томас Ман. У 1943-м годзе Жан Дэлануа зняў стужку з такой жа назвай па сцэнарыі Жана Както. У яго карціне гаворка ідзе пра вядомую гісторыю Трыстана і Ізольды: гэтыя героі, закаханыя, на думку аўтара, увесь час расстаюцца і злучаюцца, расстаюцца і злучаюцца — адсюль і "вечнае вяртанне". Урэшце, гэтая думка — усе тэмы, гісторыі лунаюць у паветры, — гучала ўжо неаднаразова. Як і тое, што сюжэты казак падарожнічаюць з народа ў народ.

У мяне было адразу некалькі варыянтаў назвы майго фільма: "Аднакурснікі", "Кінапробы" і нават "Дамскае рукадзелле ў духу Казіміра Малевіча", аднак апошні падаўся мне надта прэтэнцыёзным. А вось "Вечнае вяртанне" адпавядала галоўнай задуме. У мяне таксама ўсё паўтараецца: з рознымі людзьмі, акцёрамі тут адбываецца адно і тое ж. Хачу сказаць, што ў цэлым маё кіно — пра разнастайнасць аднастайнасці людзей і пра іх аднастайнасць разнастайнасці...

> У цэлым маё кіно — пра разнастайнасць аднастайнасці людзей і пра іх аднастайнасць разнастайнасці...

Адступленне журналіста

Тым не менш, бліжэй да сярэдзіны карціны ў рэчышча фільма ўмешваецца нечаканая сцэна з прадзюсарам і спонсарам, якія адгледжваюць зняты матэрыял нібыта загінулага рэжысёра. Спонсар вагаецца, ці даваць яму сродкі на будучую стужку. Гэтая сцэна і далейшае развіццё лініі прадзюсіравання кіно, механізма здабычы сродкаў на стварэнне арт-прадукту дадае новы фрэйм, рамку асноўнага матэрыялу карціны. Па сутнасці, рэжысёр адсылае гледача і да праблем сучаснай кінавытворчасці, рэалій, у якіх вымушаны працаваць стваральнікі аўтарскага кінематографа. І менавіта за гэтае дасціпнае звяртанне да праблем кіно, за кіно пра кіно, стужка Кіры Муратавай была адзначана спецыяльным прызам журы "Лістапада" — "За эстэтычную дзёрзкасць". Тым не менш, не магу не адзначыць пэўнай умоўнасці, фармальнасці дадзенага ходу.

Пра савецкі і сучасны кінематограф

— Сёння знайсці грошы на свае фільмы мне вельмі цяжка. Нават не хочацца пра гэта гаварыць. Але я зусім не сумую па савецкіх часах. Аніякай настальгіі. У той час мае карціны ўвогуле клалі на паліцу, і ўсё клеймавалі: маўляў, я ганьблю нашу рэальнасць, здымаю немаведама што...

Я магу смела называць сябе чалавекам перабудовы. Гэты перыяд стаўся для мяне самым плённым: раптам чамусьці ўсе пачалі называць мяне геніем і галоўнае — дазволілі здымаць усё, што пажадаю. З 1986-га па 1989-ы, калі мне ўдалося стварыць "Перамену долі", "Астэнічны сіндром", быў "залаты" перыяд. Тады "Дзяржкіно" СССР страціла адну ідэалогію і яшчэ не ўсталявалася ў іншай, а творцы сталі адносна вольнымі. Сёння ж мы становімся рабамі камерцыйнага падыходу да кіно...

Занатавала Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ
Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

Анонсы



У адным з бліжэйшых нумароў "К" распавядзе пра новыя праекты па агучванні фільмаў беларускага і сусветнага нямога кіно. Мы распытаем пра падрабязнасці "Тузіну. Немаўля", прэзентаванага і пад час нядаўняга "Лістапада" ды фестывалю "Белага люстэрка", што адбыўся паралельна з кінафорумам, у іх прадзюсараў. Таксама рэдакцыя пацікавіцца ў кінапракатчыкаў абласных і раённых цэнтраў, ці маюць яны інтарэс да падобных ініцыятыў.

На здымку: Сяргей Пукст агучвае ў якасці тапёра стужку "Кастусь Каліноўскі".
Фота Аляксандра ЖДАНОВІЧА

Стужка "Вечнае вяртанне" Кіры Муратавай, як і фільм Аляксандра Велядзінскага "Географ глобус прапіў", была закуплена для далейшых паказаў мінскім "Кінавідэапракатам". А інтэрв'ю з рэжысёрам апошняй карціны чытайце ў адным з бліжэйшых нумароў "К".

Сапраўднай "фішкай" сёлетняга "ТэАРТ"а сталася не толькі пашыраная беларуская праграма, але і, галоўнае, вельмі разгорнутая палітра спектакляў "новай драмы", а таксама разнастайных мікстаў з выкарыстаннем элементаў апошняй. Яшчэ адзін цікавы блок склалі спектаклі, так бы мовіць, на мяжы з мюзіклам. А дакладней — з асэнсавана вельмі значным музычным складнікам, які ў пэўныя моманты ўвогуле выходзіць на першы план. Ну а самай, бадай, распаўсюджанай тэмай сталі... бацькі і дзеці — амаль паводле Тургенева. Гэтае сутыкненне пакаленняў прасочвалася абсалютна ва ўсіх спектаклях, бо выяўлялася не толькі на побытава-сямейным узроўні, але і пры спалучэнні розных эпох, пашыраючыся да ўзроўню "прапрапра...дзеды і ўнукі". І ахоплівала як тэматыку, так і стылістыку, супрацьпастаўляючы ўласна тэатр з эксперыментальнымі выхадамі на перформанс, "чытку п'есы", "хатні паказ для блізкіх і родных", "інтэрнэт-абмеркаванне", музейную экспазіцыю.

Несталіца — сталіца — сусвет: вынікі "ТэАРТ"а-2013

Сімбіёзна-пераходнае...

Сцэна са спектакля "Ціхі шоргат сыходзячых крокаў".

Папярэднія артыкулы пра "ТэАРТ"-2013 чытайце ў №№ 44, 45.

Гэй, музыкі...

Павышэнне ролі жывой (!) музыкі ў многіх спектаклях — павеў часу. І адначасова — вяртанне да забытых традыцый таго ж XIX стагоддзя, калі музычных фрагментаў на спектакль было гадзіны на дзве-паўтары, а адзін толькі аркестравы ўступ (уверцюра) доўжыўся хвілін дваццаць. Вядома, цяперашняе "амузычванне" — рэха росквіту мюзіклаў ды памежных з імі жанраў, пачынаючы з брэхтаўскіх "зонгаў" і заканчваючы "навабудамі" накшталт "лайт-оперы". Але ўжо самі па сабе музыканты на сцэне — дадатковая разыначка "спектакляў", якая дапамагае гледачам пераключыцца з тэатра перажывання на тэатр паказу.

Рэжысёр Юрый Бутусаў, не афішуючы свае змяненні словамі "паводле п'есы", насамрэч даволі жорстка прайшоўся па тэксце "Добрага чалавека з Сезуана" (Маскоўскі драматычны тэатр імя А.С. Пушкіна). Шмат чаго скарацілася, ажно да некаторых дзеючых асоб, іначай расстаўлены многія акцэнты (і гэта, дадамо, яшчэ больш абуджае думку гледача). Але спектакль успрымаецца як адно з самых дакладных, нават скрупулёзных, увасабленняў Б.Брэхта — дзякуючы музыцы Паўля Дэсау, з якім супрацоўнічаў сам драматург. Бо ў гэтых зонгах, што выконваюцца на мове арыгінала, — увесь нерв спектакля, ягоны філасофскі сэнс. І яшчэ адна рыса строга вытрыманай стыльнасці.

Менавіта жывое гучанне старадаўніх інструментаў надало спектаклю "Muck" венгерскі каларыт. Знаходжанне выканаўцы ўвесь час на сцэне, але на спецыяльным прыстасаванні, ледзь не пад каласнікамі, надае аповеду дадатковы "па-надпобытавы" змест, без аніякіх масавых сцэн-карагодаў выводзіць трагедыю асобнай сям'і на фон жыцця ўсяго народа. А некалькіх паўтораў аднаго "калятанцавальнага" руху хапае, каб герой запомніўся хадой, што выдае ягоныя ўзрост, тэмперамент і, зноў-такі, нацыянальнае паходжанне.

Музыка ў варшаўскай "Апалоніі" рэжысёра Кшыштафа Варлікоўскага — іншага кшталту. "Зонгавыя" ўстаўкі, прынцыпова рознастылёвыя, ад рэтра да найноўшых джазавых адгалінаванняў, адыгрываюць ролю адасаблення, нагадваючы інтэрмедыі паміж асобнымі карцінамі ў оперы. Ну а вроцлаўская "Песня пра маці і Айчыну" рэжысёра Яна Кляты — мюзікл, хіба без танцаў. Крыху плакатны, але — "гучнагалосы".

На гэтым фоне ані не згубіўся наш кабарэ-бэнд "Сярэбранае вяселле" ў дадатковай праграме. Бо іх кірунак тэатралізаванага канцэрта, дзе сплятаюцца разам відэа, элементы лялечнага тэатра, канферансу, інтэрактыўныя гульні з гледачамі і, вядома ж, музычныя нумары з харызматычным вакалам ды высокапрафесійным інструменталам, прыпраўленым джазавымі імправізацыямі, — проста "цукерачка"! А не горкая пілюля, як большасць замежных спектакляў. Чым не разгадка "Сярэбранага вяселля", запатрабаванага ў замежжы ўсё больш?

Проба грунтоўнасці на "рэалізм"... ці мінімалізм?

Больш за ўсё цікавасці, зразумела, выклікалі прэм'еры беларускіх драматургаў, запатрабаваных у Расіі. Гэтай тэме нават быў прысвечаны чарговы і апошні за цяперашні фестываль "круглы стол" з удзелам знаных крытыкаў ды тэатральных дзеячаў суседняй дзяржавы. Праўда, "сталаваліся" яны неяк дзіўна: паселі сабе ў прэзідыуме — і давай весці размовы адно з адным, быццам нас, беларусаў, у зале няма. А сярод "публікі" былі, між іншым, не менш знаныя "тэарэтыкі і практыкі" — нашы, беларускія. У тым ліку навукоўцы, якія ўжо дысертацыі па "новай драме" абаранілі. Дый усім прысутным не цярпелася пачуць развагі: усё ж чаму гэтыя аўтары такія папулярныя ў Расіі, якія стылёвыя рысы яднаюць ці адрозніваюць іх ад іншых. Дыялог крытыкаў і даследчыкаў дзвюх краін павінен быў быць плённым! Ажно не: не склалася. Далей за прызнанні расіян, накшталт "А мне падабаецца!", справа не зрушылася. І ў які раз гонар узяў за нашых! Хаця... госці, пэўна, і свае размовы адбудавалі па прынцыпе "новага пастановачнага мінімалізму": "сцісла" (тое, што можна данесці двума сказамі, калі не словамі — гадзіны на тры), аморфна па форме, нецікава.

А што ж прэм'еры? Напаўмістычны "Ціхі шоргат сыходзячых крокаў" Дзмітрыя Багаслаўскага ставіў у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі малады кіргізскі рэжысёр Шаміль Дыйканбаеў. Літаральна ўсё было сказана ўжо першай мізансцэнай: пясок, што струменіцца замест вады з нахіленага вядра. Але аднаго прыёму на амаль трохгадзінны спектакль — малавата.

"Patris" Сяргея Анцэлевіча (ён жа — рэжысёр пастаноўкі), Дзмітрыя Багаслаўскага і Віктара Красоўскага ўспрымаўся, найперш, грамадзянскім учынкам, праяўленнем творчай смеласці — узяцца за такую складаную тэму, як патрыятызм, выкарыстаць дакументальныя здымкі з выказваннямі людзей розных пакаленняў (старэйшае прамаўляла пераважна лозунгамі, моладзь — задумвалася) і спалучыць гэта амаль з дэтэктыўным разгортам сюжэту пра тэлежурналістаў, якія і бяруць тыя інтэрв'ю.

"Маркотны хакеіст" Паўла Пражко ў пастаноўцы нашумелага расійскага рэжысёра Дзмітрыя Валкастрэлава — наадварот, быў пошукам, у першую чаргу, выразных сродкаў. Але вынікі можна было атрымаць і больш проста. Бо новае часам выглядала саматужнай імітацыяй старога. Эфект рэха, якога можна дасягнуць мікрафоннай рэверберацыяй, ствараўся адначасовым чытаннем вершаў з дзённіка ў двух маленькіх "пакойчыках" з папяровай перагародкай. Адрозненне было хіба ў тым, што "за сцяной" маглі пачаць верш не толькі пазней, але і раней. А пасля паэтычнай нізкі дэманстравалася працяглае аматарскае відэа: маўляў, у гэтым двары я жыву.

"Кароткачасовая" Канстанціна Сцешыка ў пастаноўцы Сямёна Александроўскага — гэта спачатку проста чытанне тэксту п'есы, які праецыруецца на заднюю сцяну сцэны. А далей — магчымасць для кожнага гледача самому выйсці на сцэну, паглядзець інтэр'ер хрушчовак, паслухаць у адным ці па чарзе ў некалькіх з пяцідзесяці навушнікаў той дыялог бацькі і сына, што і складае п'есу. Ёсць і запіс самога рэжысёра. Галоўнае — кожны з гэтай паўсотні дыялогаў запісаны сваякамі, рэальным бацькам і ягоным сынам.

"Shoot/Get Treasure/Repeat" Марка Равенхіла ў пастаноўцы двух апошніх згаданых рэжысёраў (пры ўдзеле Аляксандра Вартанава) імкнуўся максімальна рознабакова, праз нізку 16 асобных дзесяці- — трыццаціхвілінных сцэн-п'ес, назвы якіх асацыяваліся з сусветнай міфалогіяй і эпікай, разгледзець тэму тэрарызму. Але, пры ўсёй навізне сродкаў увасаблення і "вандровак" публікі па чатырох непрыстасаваных пакоях, часам было сумнавата. Нямецкая "Спроба грунту ў Казахстане" з'яўлялася пераносам дакументальнай стужкі на сцэну: замест акцёраў там удзельнічаюць рэальныя людзі, якія расказваюць пра саміх сябе і вядуць дыялогі са сваімі блізкімі, знятымі на камеру...

Сцэна са спектакля "Добры чалавек з Сезуана".

Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

■ Рэзюмэ

Усе гэтыя спектаклі ў чарговы раз даказалі, што ўсё дасканалае ў мастацтве вызначаецца не "іменем рэвалюцыі", а — па законах эстэтыкі. Любое мастацтва развіваецца па ўласных законах. Тое, што мы сёння назіраем у тэатры, з'яўляецца пераходам ад адной "сістэмы каардынат" да іншай. А такі злом традыцыйных выразных сродкаў не можа суправаджацца адразу шэдэўрам, як кажуць, "у апошняй інстанцыі". Бо патрабуецца — менавіта апошняя інстанцыя! Іншымі словамі, усялякая новая сістэма выразных сродкаў патрабуе не адно дэкларатыўнай "прэзентацыі", а працяглага развіцця — няспешнага, шматграннага. Мала здабыць каштоўны каменьчык — трэба яшчэ яго апрацаваць, надаць неабходную форму, змясціць у адпаведную аправу. А гэта справа не аднаго творцы — некалькіх пакаленняў. Невыпадкова самымі запатрабаванымі ў выканаўцаў і публікі становяцца не тыя творцы, што "пракладаюць шлях", а тыя, што завяршаюць пэўны гістарычны перыяд.

Сённяшняе становішча ў тэатры мне нагадвае сітуацыю з Бахам і яго сынамі. Тыя пісалі зусім іншую музыку — у параўнанні з бацькавай, надзвычай простую, калі не прымітыўную: замест поліфанічных спляценняў, дзе ўсё "зашыфравана" і мае патаемны сэнс, замест інтанацыйнага "зерня" і яго бясконцага "прарастання", што вымахвае ў магутнае разгалінаванае дрэва, — мелодыя і мінімальны акампанемент. Ну проста "дзіцячы лепет на лужку"! Творы бацькі на стагоддзе былі забыты, бо такі стыль выйшаў з моды. І адрадзілі іх толькі тады, калі да музыкі пачалі ставіцца не як да "ўпрыгожання побыту", а як да мастацтва. Творы ж сыноў, пры ўсім іх сціплым абаянні, з цягам часу саступілі месца больш дасканалым прыкладам у гэтай жа тэхніцы пісьма. Ці не такая ж функцыя ў цяперашніх "першапраходцаў"? Тым больш, што ўсе іх навацыі маюць свае "правобразы" ў гісторыі мастацтваў і з'яўляюцца, па сутнасці, "дагаворваннем" сказанага ўжо калісьці, але — на іншай мове.

Пры ўсім імкненні маладых творцаў да "рэалізму", іх пастаноўкі — партрэт, найперш, іх саміх. Выхаваных на "павуцінні", а не на "праверанай класіцы". Упэўненых у тым, што да іх нічога падобнага не было. Са сфарміраванай пагардай да "тэатральнага маўлення" старой школы, але не спрактыкаваных у акцёрскім майстэрстве настолькі, каб той "артыстызм" выглядаў натуральна — "як у кіно". Таму і мармычуць тэксты сабе пад нос з такой дыкцыяй, дзе чуваць хіба палову. Але ўсё гэта — нармальныя хібы "пераходнага перыяду", які раўназначны пераходнаму ўзросту. Таму тыя эксперыментальныя спектаклі нельга ацэньваць толькі як "завершаны прадукт". Куды больш прадуктыўна — убачыць у іх магчымыя перспектывы, цікавыя ідэі, якія можна развіваць далей і, што не менш важна, удасканальваць іх канкрэтнае ўвасабленне.

Як бы тое ні было, але галоўнае дасягненне "ТэАРТ"а як самой фестывальнай канцэпцыі — дэманстрацыя таго, што тэатр можа быць максімальна розным. Нават такім, калі ставіцца пытанне: а ці тэатр гэта ўвогуле?..

Надзея БУНЦЭВІЧ

Раскадроўка

Фокус нацыянальных кінашкол

Як пісала "К" раней, сёлета беларускае кіно спаборнічала ў многіх конкурсах. Гэта сталася добрай нагодай для вызначэння пэўнага фокусу на "Лістапад": чым жа вылучаецца наш айчынны кінапрадукт і як глядзіцца наша кіно побач з прызёрамі шматлікіх фестываляў? Што можна сказаць? Цалкам прыстойна. Але кожны конкурс выявіў свае асаблівасці і сваё месца беларускага кіно ў ім. Спынімся на конкурсе дакументальнага кіно нацыянальных кінашкол.



Кадр з фільма "Пасля Врыцэна" Даніэля Абмы.

Студэнты, механізмы і пустоты

Гэтае спаборніцтва, якое ладзіцца на "Лістападзе" другі год, пакуль не надта спешчана ўвагай журналістаў ці гледача. Летась конкурс праходзіў у сценах Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, у камернай абстаноўцы, якая спрыяла больш вольнаму абмеркаванню работ студэнтаў. Сёлета ж паказы твораў маладых кінематаграфістаў ладзіліся ў "Міры" і былі адкрытымі для публікі: на іх прадаваліся білеты. Усё гэта — спробы фарміравання конкурсу, якому, несумненна, патрэбен глядач, і які дэманструе, што студэнцкае кіно можа зусім не саступаць "даросламу". Сёлета ў праграме прадстаўлены кінашколы Германіі, Вялікабрытаніі, Францыі, Славеніі і Беларусі.

Беларусь

Цалкам у традыцыі дакументальнага кіно была прастаўлена ў конкурсе наша Акадэмія мастацтваў. У праграме — усяго дзве работы, але фільм Івана Куракевіча "Мая дыстанцыя" стаўся моцным пачаткам конкурсу.

Герой стужкі рэжысёра — чалавек, які ўсё жыццё прысвяціў бегу. Асоба, для якой рух — жыццёвая неабходнасць. Нават пасля складанай аперацыі ён імкнецца стаць на ногі і зноў бегчы. Па сутнасці, карціна рэжысёра — пра барацьбу чалавечага духу, сілу волі і ўменне змагацца да канца, калі надзеі не застаецца нават у блізкіх людзей…

— Герой ізноў перанёс аперацыю, але настрой у яго аптымістычны, — паведаміў гледачу пра далейшы лёс свайго персанажа Іван Куракевіч.

Работа Івана, які заканчвае майстэрню рэжысуры Міхаіла Жданоўскага, годна прадставіла беларускую дакументалістыку. Але ж пытанне наконт кінашколы, мяркую, засталося адкрытым, бо адной добрай карціны, відавочна, недастаткова, каб меркаваць пра цэлы курс.

Славенія

Праграма ж Акадэміі тэатра, кіно і тэлебачання пры Універсітэце Любляны (Славенія) акурат і вылучылася цэласнасцю, дазваляючы скласці ўражанне пра Школу. Яе навучэнцы імкнуліся стварыць у сваіх фільмах партрэты людзей, што з пэўных прычын адрозніваюцца ад звычайных славакаў. Домен Марцінчыч у "Божых дзецях" абраў героямі падлеткаў, чые бацькі спавядаюць вучэнне Крышны. Катарына Марана зняла стужку пра хлопчыка-аўтыста Бенджаміна, які вельмі любіць цягнікі і нумары ("Бенджамін"). А Катарына Рэшак у "Маё імя — люстэрка" стварыла партрэт маладой мусульманкі Айны: яна імкнецца выбудаваць уласную стратэгію паводзін у сучасным горадзе. Гэтая адзіная лінія — тэма ўпісанасці, уладкаванасці незвычайнага чалавека ў звычайнае грамадства, розныя варыянты яе вырашэнняў, — паўтаруся, дала магчымасць скласці ўяўленне пра курс, нацыянальную кінашколу, якая мае ўжо плеяду моладзі са сваімі поглядамі ды індывідуальнасцю.

Францыя

Вышэйшая нацыянальная школа аўдыявізуальных мастацтваў "La Femis" з Францыі яркімі работамі, на жаль, не адзначылася. Ці вінаваты ў гэтым тэхнічныя непаладкі, меркаваць складана, але праграма ні пэўнай тэматычнай лініяй, ні асобнымі праектамі не вылучылася.

Вялікабрытанія

Лонданская ж кінашкола прадставіла публіцы цалкам прыстойны і адметны кінапрадукт, які, тым не менш, назваць чыстай дакументалістыкай складана. Напрыклад, фільм "Птушка" Мікеля Гурэа — гэта партрэт прымы-балерыны Лонданскага Каралеўскага балета Ітзэар Мендзізабал. Стужка зроблена з элементамі харэаграфічных нумароў ды нават пастаноўкі, танца, які дазваляе больш раскрыць характар творцы. Але, адзначаючы прыгажосць карціны, нельга не задацца пытаннем наконт прыналежнасці да дакументальнага жанру.

— Больш за 90% студэнтаў гэтай вядомай інстытуцыі ў далейшым, упэўнены, будуць здымаць ігравое кіно, — пракаментаваў асаблівасць падыходу да навучання ў Лондане старшыня міжнароднага журы конкурсу маладога дакументальнага кіно, рэжысёр, прафесар Усерасійскага дзяржаўнага ўніверсітэта кінематаграфіі імя С.А. Герасімава Барыс Караджаў. — Бачна, што гэтыя стужкі — практыкаванне. Так, з ім студэнты добра справіліся, але я не бачу перспектывы: ці застануцца гэтыя людзі ў дакументалістыцы? І ўзнікае пытанне: ці знаходзяцца ўвогуле дадзеныя работы ў адпаведным іх узроўню конкурсе?..

Германія

З аднаго боку, прафесар мае рацыю. З іншага ж, магчыма, хтосьці спытае: а ці не можа дакументальнае кіно быць эстэцкім? Гэтую дылему акурат і вырашыў чацвёрты канкурсант — Вышэйшая школа кіно і тэлебачання імя Конрада Вольфа (Германія), якая прадэманстравала работы неверагоднай глыбіні і сэнсу, не пазбаўленыя, між тым, і высокамастацкіх рашэнняў. Стужка Джазэфіны Лінкс "Мы паміраем" — гэта своеасаблівы фільм-развітанне аўтара карціны са сваёй бабуляй, зроблены так кранальна ды пяшчотна, прыгожа і тонка, што тэма смерці паўстае ў іншым ракурсе: як момант нашай агульнай страты ды непазбежнасці…

"Пасля Врыцэна" Даніэля Абмы — кінадаследаванне, якому ўвогуле ўдалося выявіць няўлоўныя механізмы існавання чалавека ў соцыуме: і як ахвяры апошняга, і як яго спажыўца. Больш за тры гады аўтар карціны назіраў за жыццямі трох правапарушальнікаў з турмы Врыцэна, што ў Брандэнбургу, пачынаючы з першага дня іх вызвалення — і далей, фіксуючы спробы хлопцаў пачаць "нармальнае жыццё": уладкавацца на працу, стварыць сям'ю… Дзякуючы падыходу, цярпенню і пільнаму воку рэжысёра, стужка раскрывае нават больш, чым глядач здольны ўявіць: не толькі лад ці хібы нямецкіх сацыяльных службаў, што дапамагаюць вызваленым адаптавацца, але і прыроду чалавечай слабасці, заганы, якая, нібы пустазелле, прабіваецца ў пустоты душы. Аўтар фіксуе гэты паступовы (амаль незаўважны) шлях герояў стужкі: ад хваляванняў ды спадзеваў на новае жыццё — да злому і стагнацыі. І — перад намі ўжо не толькі лёс асобных трох характараў, але і адлюстраванне часткі грамадства, яго хваробаў ды механізмаў патурання ім. Структура стужкі Даніэля Абмы, работа з героямі карціны, калі аўтару ўдалося выбудаваць дакладную дыстанцыю паміж сабой і яе персанажамі, робяць "Пасля Врыцэна" папраўдзе выбітным кіно. І ў дадзеным кантэксце, адзначаючы і вартасці беларускіх карцін, нашаму кіно усё ж ёсць чаму павучыцца.

Пра фармат

Конкурс выявіў не толькі асаблівасці кінашкол, але і шмат недапрацовак у ягоным фармаце. Адрозненні ў памеры бюджэтаў, магутнасцях інстытуцый ды ў іх падыходах былі заўважныя.

— Конкурс кінашкол мае сваю спецыфіку — гэта не проста конкурс фільмаў, — падзяліўся сваёй думкай з карэспандэнтам "К" Барыс Караджаў, — тут значна больш вымярэнняў. І арганізатарам фестывалю варта было б выпрацаваць больш дакладную стратэгію: альбо гэта конкурс менавіта дакументальнага кіно, альбо — студэнцкага, і тады тут могуць спаборнічаць, напрыклад, і анімацыйныя стужкі. Сённяшніх удзельнікаў параўноўваць было вельмі складана…

Яшчэ прафесар звярнуў увагу на неабходнасць папулярызацыі дакументалістыкі. Каб паказы дакументальнага кіно не праходзілі ў пустых залах, неабходна, каб яны сталі рэгулярнай практыкай.

— Бо што такое, у рэшце рэшт, школа? Гэта, у тым ліку, і прысутнасць гледача ў кіназале. Калі малады кінематаграфіст бачыць рэакцыю публікі на свой фільм — гэта спрыяе яго развіццю. Дзеля гэтага варта ладзіць не толькі разавыя прэм'еры, а і пашыраць сетку кінаклубаў дакументальнага кіно, праводзіць фестывалі. Усё гэта разам выхоўвае публіку і развівае рэжысёра. Конкурс нацыянальных кінашкол у гэтым плане — вельмі добры прыклад, але хацелася б, каб ён набыў дакладны формат і папулярнасць…

Пераможцам конкурсу дакументальнага кіно нацыянальных кінашкол стаў фільм "Пасля Врыцэна" Даніэля Абмы з Германіі. Беларускі рэжысёр Іван Куракевіч, аўтар карціны "Мая дыстанцыя", быў адзначаны спецыяльным дыпломам "За прытрымліванне традыцый школы беларускага дакументальнага кіно".

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Працяг фестывальнай тэмы — у наступных нумарах.

Мастыхін

21 лістапада ў Мінскай ратушы (філіял Музея гісторыі горада Мінска) адбудзецца вернісаж жывапісу і графікі заслужанага работніка культуры Рэспублікі Беларусь, вядомага мастака і педагога, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Аляксандра Казлоўскага, прысвечаны 90-годдзю з дня яго нараджэння. А 8 снежня споўніцца два гады, як не стала Аляксандра Сцяпанавіча, і, такім чынам, выстаўка адначасова з'яўляецца і памятнай.

Ён нарадзіўся пад сузор'ем Вадалея, 27 студзеня 1923 года ў вёсцы Вялікія Труханавічы Чашніцкага раёна Віцебшчыны. Нарадзіўся, каб прысвяціць сваё жыццё Мастацтву і выхаванню ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце (пазней — Акадэміі мастацтваў) некалькіх пакаленняў маладых творцаў. Бо ўласны жывапіс і рысаванне ён не аддзяляў ад актыўнай педагагічнай ды грамадскай дзейнасці.

Усхваляванасць пачуццяў, трапятлівасць, музычнасць фарбаў, найтанчэйшая паэзія і артыстызм пэндзля, — вось стыль лепшых твораў Казлоўскага, асабліва ў пейзажным жывапісе. Так здарылася, што пры жыцці ён не быў "раскручаны" мастацтвазнаўцамі і журналістамі, у адрозненне ад некаторых яго прасунутых супольнікаў. Прыродная сціпласць ды ўнутраная гордасць, памножаная на залішне крытычную самаацэнку ўласнай творчасці, не дазвалялі яму ісці па галовах сваіх калег, каб "адліць у бронзе" сваё імя…

Таму сённяшняя выстаўка-рэтраспекцыя ў нейкай ступені, хачу верыць, адновіць справядлівасць. Канешне ж, у экспазіцыі адсутнічае шэраг буйнамаштабных фігуратыўных ды пейзажных палотнаў Казлоўскага, якія знаходзяцца ў калекцыях дзяржаўных музеяў і ў Чашніцкім гістарычным музеі — на радзіме мастака. Аднак і тое, што мы бачым на сённяшняй вы-

Акцыя

Карціны ў дар музею

Нядаўна член Маскоўскага саюза мастакоў Кацярына Болценка-Казанская перадала ў дар Беларускаму дзяржаўнаму музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны карціны "Хатынь" (на рэпрадукцыі ніжэй) і "Масква. 1941 г.". Гэтыя палотны напісаў ейны бацька — мастак-жывапісец Міхаіл Казанскі (1932 — 2003 гг.).

Казанскі на пачатку 1950-х два гады навучаўся ў В.Цвірко ў нашым Тэатральна-мастацкім інстытуце разам з Л.Шчамялёвым, В.Грамыкам і Б.Аракчэевым, потым прадоўжыў навучанне ў Ленінградскай акадэміі мастацтваў імя І.Рэпіна. Ён часта бываў на Беларусі, меў да яе асаблівыя пачуцці — тут нараджаліся тэмы і сюжэты яго карцін, якія захоўваюцца ў фондах Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі ды ў іншых музеях Расіі…

Ва ўрачыстай перадачы твораў узялі ўдзел супрацоўнікі Музея гісторыі Вялікай Айчыннай. А дырэктар генерал-маёр запасу Мікалай Скобелеў цёпла падзякаваў Кацярыне Міхайлаўне за дар і ўручыў ёй памятную кнігу "Партызанскі альманах".

Мікалай ШАЎЧЭНКА, член Беларускага саюза журналістаў, падпалкоўнік запасу

Пад сузор'ем Вадалея

Рэтраспекцыя ў Ратушы: усхваляваны рамантык і маленькія шэдэўры

А.Казлоўскі. "Парыж. Вія Фраціна ноччу." 1961 г.

стаўцы, для гледачоў, культуролагаў, для яго вучняў, для нашага мастацтвазнаўчага братэрства ўяўляе жывую і непадробную цікавасць.

Прафесійная адукацыя ў Аляксандра Сцяпанавіча была выдатная: да вайны пачынаў з вучобы ў Ленінградскай сярэдняй мастацкай школе пры Усерасійскай акадэміі мастацтва, а ў 1956-м атрымаў дыплом з адзнакай у Інстытуце жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І.Я. Рэпіна, дзе вучыўся ў В.Сакалова і Ю.Няпрынцава. Дарэчы, ягоны дыплом "На працу ў вёску" зараз упрыгожвае Валагодскую карцінную галерэю.

Сюжэтных палотнаў у Казлоўскага параўнальна няшмат, прычым лепшыя з іх былі напісаны ў 1970 — 80-я гады. Я добра памятаю яго фігуратыўныя карціны "9 мая", "Успаміны", "Мужнасць", "Ледаход на Енісеі", "Вясна Перамогі". Асабліва мне падабаецца рамантычны твор "Трывога": імчыць наўскач на запененым залацістым кані вершнік з высока ўзнятай рукой. Карціна, напісаная ў складаных лілова-сінявата-зеленаватых тонах, — хвалюючая і запамінальная. Якую вестку нясе нам узбуджаны юнак? Пра вайну, што раптоўна пачалася? Ці пра іншае драматычнае здарэнне ў жыцці народа? Гледачу ёсць пра што падумаць, гледзячы на гэтую кампазіцыю...

Пачынаў Казлоўскі "як усе". Імкнуўся максімальна, як мага падрабязней і аб'ектыўней, адлюстраваць на палатне абраную "мадэль", "прадмет" ці "з'яву". Канец 1950-х — пачатак 60-х гадоў — гэта пік "сацрэалізму"; пасля ж гэты метад паступова стаў страчваць свой галоўны ідэалагічны складнік і пачаў плаўна пераходзіць у "суровы стыль". Аднак большасць савецкіх мастакоў яшчэ цвёрда кіраваліся традыцыямі "сацыялістычнага па змесце" мастацтва. Хтосьці — са шчырай верай, хтосьці павінен быў, наступаючы на "горла ўласнай песні", рухацца ў агульнай каляіне, баючыся зрабіць крок убок... Хаця і сярод такіх рэалістаў-традыцыяналістаў былі выдатныя майстры пэндзля кшталту А.Пластава, Д.Мачальскага, А.Лактыёнава, Ю.Няпрынцава, братоў С. і А. Ткачовых, нашых В.Волкава, І.Ахрэмчыка, Я.Зайцава, ранняга М.Савіцкага... Дыплом А.Казлоўскага якраз і быў напісаны ў гэтым рэалістычным рэчышчы рускіх перасоўнікаў. Аднак праз гады творца зноў вярнуўся да гэтай тэмы — прыезду маладой настаўніцы ў вёску, — і зрабіў своеасаблівы "рымэйк", дзе шмат чаго змяніў у пейзажы, у кампазіцыйных дэталях ды, асабліва, у каларыстыцы.

У 1961 годзе мастак стаў стыпендыятам UNESCO і атрымаў трохмесячную творчую паездку ў Францыю ды Італію. Акрамя наведвання лепшых еўрапейскіх музеяў, ён пазнаёміўся з М.Шагалам, Н.Хадасевіч-Лежэ, А.Фужэронам, К.Мацолай, Л.Фантанарозам. Але галоўнае, што ён вынес з гэтай камандзіроўкі, — гэта зусім новае пачуццё жывапіснай пластыкі, заснаванай на левітанаўскай празрыстасці ды адначасова на імпрэсіяністычнай лёгкасці "жывой" матэрыі.

Мастак проста не здольны быць у чымсьці няшчырым, націскаць на педалі "найгрышу" — ягоны пэндзаль можа ісці толькі ўслед за жывым, непасрэдным назіраннем. Вось як мы жывём, быццам бы кажуць яго палотны. Такія ў нас людзі, такая цудоўная зямля ў розныя поры года: паплавы ранняй вясной, на якіх гуляюць амаль казачныя коні; такія ў нас блакітныя рэчкі ды азёры ў туманнай смузе, рухавыя ружовыя ды смарагдавыя воблакі; дрэвы, афарбаваныя барвай і золатам восені; летнія дажджы, якія абмываюць гарадскія брукі ды набярэжныя; утульныя драўляныя дамкі роднай Віцебшчыны, дахі якіх накрытыя асляпляльна-белым снегам…

Мастак умее весці гутарку з прыродай, умее спасцігаць ейныя мудрагелістыя таямніцы, улоўліваць яе найтанчэйшы стан. Адсюль — унутранае багацце і значнасць не толькі ягоных лепшых кампазіцыйных палотнаў, але і натурных аднасеансных эцюдаў, разнастайных па настроі ды эмацыйнай выразнасці. Яго цудоўныя "французскія" і "італьянскія" эцюды я наогул лічу маленькімі шэдэўрамі ў галіне імпрэсіяністычнай каларыстыкі.

Рамантык па натуры, Казлоўскі не быў прыхільнікам абстрактных мастацкіх сімвалаў, разумовых алегорый і складаных "постмадэрнавых" метафар. Яго рамантызм, рамантызм духу і душы, убіраў у сябе светлую радаснасць і "цеплатворнасць" успрымання рэальнасці, спакойную раздумлівую інтанацыю, якую ён заўсёды знаходзіў у прыродзе роднай Беларусі, Украіны, Расіі, Прыбалтыкі, краін Заходняй Еўропы. А часам, асабліва ў позніх работах, мы можам адчуць і шчымлівую настальгію аўтара па даўно прамінулай маладосці…

Барыс КРЭПАК

Вернісаж

На Віцебшчыне — сапраўдны бум адкрыцця помнікаў і скульптурных кампазіцый. Так, Лёзна ўзбагацілася выявай Марка Шагала (скульптары — Аляксандр Гвоздзікаў і Азат Тарасян). А ў Лепелі з'явіўся Цмок аўтарства Льва Аганава.

Прэзентацыя



Тэатр сучаснай харэаграфіі "D.O.Z.SK.I.", які цяпер уваходзіць у склад Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра, прадстаўляе чарговую прэм'еру — пластычную пастаноўку "[BRED] насущный". Таксама ў бліжэйшых планах вядомага калектыву — удзел у XXVI Міжнародным фестывалі сучаснай харэаграфіі, які ўрачыста адкрыецца 20 лістапада ў Віцебску.

Мастыхін

"Дэкарацыя для мары

Так, паводле аднаго са сваіх твораў, назвала персанальную выстаўку ў Светлагорскай карціннай галерэі Традыцыя" імя Германа Пранішнікава цудоўная мінская мастачка Алена Шлегель.

А.Шлегель. "Дэкарацыя для мары".

Ужо ў самой назве экспазіцыі — прысутнасць пэўнай тэатральнасці. Дэкарацыя можа быць жывапісным або архітэктурным увасабленнем месца дзеяння. Умоўнасць яе ўсе разумеюць. Але ў тым і таямніца таленавітага мастака: надаць уяўнаму адчуванне сапраўднасці. Ды і апісаць мару трэба так, каб яна стала ўвасабленнем рэальнасці, застаючыся ўсё ж сабой.

Пытаюся ў Алены пра тое, чаму менавіта "дэкарацыі для мары", а не — ілюстрацыі? І чую: "Сярод дэкарацый можна жыць, а сярод ілюстрацый — немагчыма". Вось так. Мастачка жыве ў тым, што стварае. Можа, таму нічога канчаткова не дапісвае — пакідае гэта рабіць нашым вачам і пачуццям. Няўжо сапраўды ўсё завершана напісанае самазнішчаецца? А гэтыя трапяткія карціны — жывыя, так і хочацца сказаць — самаствaральныя. Пазачасавыя, пазапрасторавыя…

Вось і загалоўны твор: "Дэкарацыя для мары". У дымчата-каляровым паветры, нібыта прывідна, узнікае і знікае палацавая прыгажосць. А побач — выпадкова невыпадковыя рэчы. Шахматныя фігуркі. Каменны, але надзіва празрысты шар, кветкі… І над усім — засяроджаны музыка, які грае на жалейцы сваю мару. Зрэшты, тоеснасць мрояў, казак ды міфаў вельмі натуральна адчуваецца ў кожнай рабоце, фрагментарна сабранай не толькі прадметна, але і каларыстычна. Пры гэтым ніякай рызыкі перанасычанасці, фарбавай стракатасці — цэласная неабмежаванасць. "Сады Семіраміды", "Атлантыда", "Дзяды", "Арыядна і Вакх"… Які прасторавы дыяпазон мрояў мастачкі! Яе "Рукадзельніца" стварае з нітак палатно, а на ім… ажывае горад. Не, бязлюднымі ейныя творы ніяк не назавеш: героі мар мастачкі праступаюць праз час, праз казачнасць прасторы і самі робяцца рэальна нерэальнымі. Яны могуць апынуцца "Паміж двух Месяцаў" або ў "Краіне мрояў", паблізу "Малочных рэк" і "Жывой вады". Яны загадваюць "Тры жаданні", збіраюць казачныя "Калекцыі". А яшчэ Алена Шлегель стварыла свой маляўнічы "Алфавіт", які вельмі натуральна пачынаецца з "Апельсіна" і заканчваецца "Яблыкам". Яе дыптых "Калекцыя" таксама адлюстроўвае толькі тое, што можна асацыятыўна адчуць, а потым паспрабаваць убачыць.

"Я пішу тое, чаго мне не хапае ў жыцці. Але калі бачу, што прадмет пачынае быць пазнавальным, спыняюся і не дапісваю, бо ўвасобленая мара сапраўды перастае быць марай", — удакладняе Алена. Свой жывапісны стыль яна нечакана называе куртуазным рамантызмам. Такі ветлівы, прыязны рамантызм быў некалі ўласцівы лірыцы заходнееўрапейскага Сярэднявечча, якая ўслаўляла рыцарскі гонар, рыцарскае каханне… Што ж, марам падуладна і гэткае. Асабліва калі яны падмацаваны такім існасным талентам, якім валодае Алена Шлегель.

Ізяслаў КАТЛЯРОЎ
Светлагорск

На пытанні чытачоў і журналістаў "К" **адказвае сенатар Святлана САРОКА**

Установа культуры:

12 лістапада ў рэдакцыі нашай газеты прайшла традыцыйная "гарачая лінія" з удзелам члена Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дырэктара Палаца культуры Маладзечна Святланай САРОКА. Як і паведамлялася, сустрэча была прысвечана праблемам у сферы рэгіянальнай культуры, выяўленым пад час сёлетняга аўтатура нашых журналістаў па ўстановах культуры ўсіх абласцей рэспублікі.

Замест адной анансаванай гадзіны гаворка цягнулася ажно тры. Пытанні чытачоў, дасланыя па электроннай пошце, зададзеныя па тэлефонах і з дапамогай сацыяльных сетак, мы вырашылі змясціць асобнымі блокамі.

Яўген РАГІН:

— Святлана Рыгораўна, рэдакцыя ўдзячная, што вы аператыўна адгукнуліся на нашу просьбу паўдзельнічаць у "гарачай лініі". Мы ведаем пра вашу выніковую працу і ў якасці кіраўніка адной з найбуйных у рэспубліцы ўстаноў культуры, і ў якасці сенатара… Ваш Палац па-ранейшаму выдае сваю газету?

Святлана САРОКА:

— Так. Справа ў тым, што ў за мінулы год прайшло ці не 500 мерапрыемстваў, з іх звыш сарака — міжнароднага і рэспубліканскага ўзроўню. Мясцовы друк пра кожную падзею распавесці проста не здатны. Робім гэта самі. Добрая і пастаянная рэклама яшчэ нікому не пашкодзіла.

Яўген РАГІН:

— Занятак законатворчасцю не замінае творчай працы?

Святлана САРОКА:

— У адрозненне ад дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, мы — неадрыўныя ад асноўнай працы. Так што колькасць мерапрыемстваў у нас не зніжаецца. Хоць клопату хапае і ў Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці. У мяне — тры раёны: Стаўбцоўскі, Валожынскі і Маладзечанскі. Таму іншым разам і выхадных няма…

Яўген РАГІН:

— Ці адчуваеце ўплывовасць і дзейснасць сваёй працы ў Пастаяннай камісіі?

Святлана САРОКА:

— Лічу, што майго аўтарытэту і досведу для гэтага хапае. І да рэспубліканскіх "Дажынак" мы здолелі пабудаваць у Маладзечне канцэртную пляцоўку больш чым на дзве тысячы месцаў, якая размяшчаецца ў цэнтры горада. Я вельмі ўдзячная, што да мяне прыслухаліся тагачасны губернатар, Мінскграмадзянпраект, будаўнікі. Цяпер пляцоўка дзейнічае з мая да сярэдзіны кастрычніка… Але не падумайце, што імкнуся дапамагчы толькі роднаму гораду.

Яўген РАГІН:

— У чым, на ваш погляд, асноўныя праблемы рэгіянальнай культуры?

Святлана САРОКА:

— Для таго, каб быць запатрабаванай, установа культуры змушана пастаянна набываць навінкі тэхнічнага абсталявання. А дадатковае фінансаванне — заўжды праблемнае. Дзеючыя тыпавыя штаты клубных устаноў, метадычных цэнтраў былі зацверджаны ў 1996 годзе, і яны, натуральна, не адпавядаюць сучасным патрабаванням А работнікам культуры сёння трэба займацца інфармацыйна-аналітычнай работай, а таксама — методыкай, рэкламай, маркетынгам, абслугоўваннем гука-, святла-, відэакомплексаў.

Кастусь АНТАНОВІЧ:

— Менавіта з гэтымі праблемамі нам і даводзілася сутыкацца пад час нашага аўтатура па абласцях Беларусі. Я дадаў бы да пералічанага вамі шэрагу і кадравы дэфіцыт. Заробак у маладых спецыялістаў — мізэрны. Жыллём іх не надта забяспечваюць і ў горадзе, і на вёсцы…

Пытанні з электроннай пошты і сацыяльных сетак

— Некалькі гадоў працую ў сферы культуры на Віцебшчыне. Рэгулярна ўдзельнічаю ў раённых семінарах. Але ж хацелася б пазнаёміцца і з вопытам іншых абласцей. Наколькі пашырана практыка такіх маштабных міжрэгіянальных мерапрыемстваў?

Святлана САРОКА:

— Так, сацыяльна-культурную дзейнасць у сучасных умовах нельга ўявіць без інавацый, крэатыўных ідэй, новых тэхналогій і методык. Магу сказаць, што Мінская вобласць вядзе актыўны культурны дыялог з рэгіёнамі рэспублікі. Удзельнікі апошніх семінараў пазнаёміліся з дзейнасцю дамоў культуры і цэнтраў рамёстваў, актыўна ўдзельнічалі ў інтэрактыўных занятках, "круглых сталах", абмяркоўвалі тэндэнцыі ды перспектывы развіцця народнай творчасці. На абласным узроўні праводзяцца саветы дырэктараў метадычных цэнтраў, абласныя семінары-практыкумы з выездамі ў рэгіёны, творчыя лабараторыі для кіраўнікоў калектываў, а таксама майстар-класы дзеячаў культуры і мастацтва пад час правядзення фестываляў і конкурсаў…

— Некаторыя начальнікі аддзелаў ставяць пытанне аб немэтазгоднасці надання статуса юрыдычнай асобы ўстановам культуры, якія ўваходзяць у склад аддзела...

Святлана САРОКА:

— Згодна з Указам Прэзідэнта ад 23 кастрычніка 2006 года № 631 "Аб структуры, функцыях і колькасці работнікаў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў", у структуры аддзела могуць быць сектары і групы. Іншых структур не прадугледжана. Стварэнне асобных устаноў з правам юрыдычнай асобы запатрабуе ўтварэнне бухгалтарскай службы, увядзенне пасад, якія будуць забяспечваць гаспадарчае функцыянаванне. Можна прапанаваць наступнае: стварыць установу культуры (раённы Цэнтр культуры або раённую бібліятэку са статусам юрасобы), а ўсе іншыя (клубы, бібліятэкі і г. д.) уключыць у склад такой установы ў якасці структурных падраздзяленняў ці філіялаў. А можна і стварыць установу культуры змяшанага тыпу. У склад яе ў якасці структурных падраздзяленняў або філіялаў увойдуць бібліятэкі, клубы, музеі. Такая ўстанова будзе мець бухгалтэрыю, гаспадарчы аддзел, іншыя службы. У адпаведнасці з асаблівасцямі раёна могуць быць іншыя варыянты. Але стварэнне ўстаноў, пазначаных вышэй, будзе адпавядаць патрабаванням Грамадзянскага кодэкса, Закону "Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь" і забяспечыць цэнтралізацыю культуры на раённым узроўні. Цяпер Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь вырашае пытанне фінансавання ўстаноў змяшанага тыпу.

На людным месцы

Чэмпіёны па... фальклоры

У той час як Мінск яшчэ толькі рыхтуецца да Чэмпіянату свету па хакеі, што пройдзе ў маі, аркестр народных інструментаў Лідскага дзяржаўнага каледжа ўжо пабываў на Сусветным чэмпіянаце — па фальклоры. І прывёз з "World folk-2013" у Балгарыі ажно сем (!) узнагарод, уключаючы залаты медаль і званне абсалютнага чэмпіёна.

ЛІДА

Праўда, для тых, хто ведае гэты славуты калектыў, даўно ўганараваны званнем народнага, такая яго гучная перамога — зусім не сенсацыя. Калі раней аркестр трывала "калекцыянаваў" дыпломы рэспубліканскіх спаборніцтваў ды разнастайных рэгіянальных аглядаў, удзельнічаў у разнастайных беларускіх праектах, уключаючы "Музычныя вечары ў Лідскім замку", дык у апошнія гады выйшаў на замежную арбіту. І пачаў адразу з Францыі: два гады таму стаў удзельнікам XXV Інтэрнацыянальнага фестывалю ўніверсітэцкай музыкі ў Бельфоры. Летась жа паехаў "збіраць медалі" ўжо на два Міжнародныя конкурсы баяністаў-акардэністаў — ва Украіне і Італіі.

Вынік — абодва першыя месцы: на V "Perpetuum mobile" ў горадзе Драгобыч на Львоўшчыне і XXII "Citta di Lanciano" (г. Ланчана). Акрамя таго, яшчэ чатыры ўдзельнікі аркестра сталі на італьянскім форуме лаўрэатамі і ўладальнікамі спецыяльных прызоў. Нарэшце, адштурхнуўшыся ад тых пяці конкурсных узнагарод у Італіі, аркестр узяў новую планку: "шчаслівую сямёрку" ў балгарскім горадзе Несэбрэ. Але ж колькасць — не галоўнае! На ўсіх гэтых форумах аркестр не толькі ўслаўляў нашу нацыянальную выканальніцкую школу, але і папулярызаваў музыку беларускіх кампазітараў Яўгена Глебава, Ігара Лучанка, Вячаслава Кузняцова, Валерыя Іванова, Уладзіміра Грушэўскага, Віктара Шчэрбы.

— Запрашэнню за Сусветны чэмпіянат па фальклоры, — распавядае мастацкі кіраўнік аркестра, намеснік дырэктара каледжа па вучэбнай рабоце Алена Сячко, — папярэднічаў адбор па відэазапісах. Да таго ж, удзельнічаць у гэтым найпрэстыжным спаборніцтве маглі толькі тыя, хто ўжо мае лаўрэацкія званні, прычым міжнародных конкурсаў. Ужо адно гэта сведчыць аб прэстыжнасці чэмпіянату, што праходзіць пад эгідай UNESCO. Усе выступленні адбываюцца на адкрытых пляцоўках, кожны ўдзельнік выступае пад сцягам сваёй краіны, абавязкова рыхтуе прывітанні — па-балгарску і на сваёй роднай мове.

Аркестр народных інструментаў Лідскага дзяржаўнага музычнага каледжа заваяваў сем узнагарод на "World folk-2013".

Намінацыі на "World folk" — самыя розныя: ад сольных і харавых спеваў да танцавальных і аўтэнтычных калектываў. Мы выступалі ў намінацыі "Інструментальнае мастацтва" — адной з самых "густанаселеных". Рыхтавалі тры рознахарактарныя выступленні: на 10, 15 і 20 хвілін. У кожную з гэтых мініпраграм уключалі, найперш, беларускія творы. Хваляваліся, як іх успрымуць, бо ўсяго ў чэмпіянаце бралі ўдзел ажно 24 краіны, у тым ліку Бразілія, Грузія, Грэцыя, Егіпет, Інданезія, Індыя, Македонія, Румынія. Хвалявалася я і за сваіх навучэнцаў, бо прыехалі мы а 5-й гадзіне раніцы, а першае выступленне павінна было адбыцца ў той жа дзень увечары — а 20-й. Што, як да таго часу яны страцяць канцэртны імпэт? Але як убачылі мора — усё напружанне быццам хваляй змыла... Так і склаўся распарадак дня: зранку — мора, удзень — рэпетыцыя, увечары — канцэрт. Дый рэпетыцыі нашы, як мы заўважылі, іншыя ўдзельнікі форуму не прапускалі. Не толькі нашы непасрэдныя "канкурэнты", але і тыя, хто выступаў у іншых намінацыях, цікавіліся нашай музыкай, інструментамі, выказвалі захапленне ад нашай ігры. Але ўсё роўна, калі аркестру пачалі ўручаць столькі ўзнагарод — Кубак абсалютнага чэмпіёна, залаты медаль, дыпломы, прызы, — мы ажно разгубіліся. Сярод спецыяльных прызоў асабліва важныя, на мой погляд, два: "Адкрыццё" і "За значны ўнёсак у захаванне і развіццё нацыянальных традыцый". Дадам, што наш аркестр — не адзіны ў каледжы калектыў-лаўрэат, які так паспяхова выступае ў краіне і за яе межамі. У хуткім часе каледжу споўніцца 40 гадоў — на ўрачыстасцях сваё майстэрства прадэманструюць усе!..

Надзея БУНЦЭВІЧ

Фота Дзяніса АНАНЬЕВА

пошукі рэцэпту запатрабаванасці

Святлана САРОКА:

— Галоўны фактар, які ўплывае на стан забяспечанасці ўстановы культуры маладымі спецыялістамі, — невялікая заработная плата і немагчымасць забяспечыць іх пражываннем. На жаль, сярэдняя зарплата ў сферы культуры застаецца адной з самых нізкіх сярод галін народнай гаспадаркі і склала ў 2013 годзе 2,5 млн. рублёў.

Мы ў сябе гэтае пытанне збольшага вырашылі: і заробкі маладым за кошт пазабюджэту павышаем, і ў жыллі яны не маюць патрэбы… Я ўпэўнена, што агульнарэспубліканскую праблему вырашаць трэба наступным чынам: спачатку дасканала прааналізаваць працэсы міграцыі маладых спецыялістаў, зрабіць высновы і сфарміраваць на іх падставе дзейсную кадравую палітыку. У адваротным выпадку, нашы маладыя калегі пойдуць у камерцыю…

Пытанні з электроннай пошты і сацыяльных сетак

— Самаакупнасць ГДК і СДК — справа рэальная? І па чым вызначаецца эфектыўнасць працы такіх устаноў?

Святлана САРОКА:

— Яны — бюджэтныя ўстановы і не ставяць за мэту самаакупнасць. Але кожная ўстанова мае план па аказанні платных паслуг, таму ў сетцы працы — і платныя мерапрыемствы. Выкананне плана дазваляе кампенсаваць у пэўнай ступені выдаткі на на цепла- і электраэнергію. І ў той жа час, выкананне плана — доказ запатрабаванасці паслуг ГДК і СДК, а значыць — і адзін з асноўных паказчыкаў эфектыўнасці іх працы. Прывяду канкрэтныя лічбы. За студзень — кастрычнік бягучага года даход ад пазабюджэтнай дзейнасці толькі па арганізацыях культуры Мінскай вобласці склаў 26 742,8 млн. рублёў, што адпавядае 148,5% да адпаведнага перыяду мінулага года. І гэта пры даведзеным паказчыку павелічэння пазабюджэтных даходаў па праграме "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады ў 105%! Заробленыя сродкі выдаткоўваюцца на стымуляванне работнікаў арганізацый ды на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы.

— Як быць з тым, што непаўналетнім забаронена знаходзіцца на дыскатэцы пасля 10-й гадзіны вечара? Такія мерапрыемствы ўжо не карыстаюцца попытам…

Святлана САРОКА:

— Ведаю, які шырокі розгалас выклікалі змяненні ў Законе Рэспублікі Беларусь "Аб асновах сістэмы прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх" ад 5 верасня 2012 года. Палажэнне артыкула 17.13. Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях паўплывала на правядзенне дыскатэк і ў СДК Маладзечанскага раёна. Пасля 22.00 моладзь бавіць час немаведама дзе і займаецца пры гэтым немаведама чым. А магла б выплёскваць энергію ў танцы, а не па-за клубам. Атрымліваецца, што днём мы прываблiваем падлеткаў заняткамі ў клубных фарміраваннях, а ўвечары — прапануем пакінуць установу. Такім чынам зніжаецца давер да культурнага цэнтра. Але маюцца і іншыя прыклады. На той жа Гродзеншчыне, калі па ўзгадненні з аблвыканкамам забаўляльныя мерапрыемствы пэўных дзяржаўных арганізацый выходзяць за рамкі часавых абмежаванняў. Так, шэраг кінатэатраў Гродзенскай вобласці быў абсталяваны пад дыскатэкі, кафэ і цяпер працуе да 4-й раніцы. Такім чынам, відавочна, што многія пытанні вырашаюцца раённым і абласным кіраўніцтвам.

Яўген РАГІН:

— Пад час аўтавандроўкі мы пабывалі летам і на Стаўбцоўшчыне, у вёсцы Заямнае. Дык вось там тры гады таму згарэў клуб. Яго ўзнаўляе прыватнік з мэтай стварыць у ім культурна-забаўляльны комплекс. Але будоўля была "замарожана". Мы разумеем, што да Стоўбцаў — рукой падаць. Але мясцовая моладзь не жадае хадзіць у клуб за тры кіламетры, а свайго — пакуль няма. Вельмі хацелася б, каб вы паўплывалі на сітуацыю, бо Заямнае — аграгарадок…

Святлана САРОКА:

— У Заямным я была неаднаразова, аднак ніхто не звярнуўся да мяне з гэтым пытаннем. Вельмі актыўны там старшыня сельсавета, а таксама старшыня Стаўбцоўскага райвыканкама. Пры сустрэчы я абавязкова ўзніму гэтае пытанне: разумею, што і моладзі, і яе бацькам, канешне ж, больш зручна мець Дом культуры ў сваім аграгарадку.

Яўген РАГІН:

— Ведаю, у асобных раёнах існуе практыка, калі флагманы сферы культуры выконваюць не толькі свой план аказання платных паслуг, але яшчэ і за некалькі арганізацый…

Святлана САРОКА:

— Я падтрымліваю раённых кіраўнікоў сферы культуры, якія асабіста вызначаюць планы аказання платных паслуг сярод устаноў, разумеючы, што адзін сельскі клуб, куды ходзяць, умоўна кажучы, тры бабулі, ніколі не выканае план і на 105 працэнтаў, а іншы, для якога набыта сучаснае абсталяванне, дзе маецца шыкоўная глядзельная зала, без цяжкасцей зможа ці не ўдвая павялічыць мінулагоднія паказчыкі. Словам, у гэтай справе важныя аб'ектыўнасць і разумны падыход.

Яўген РАГІН:

— Не магу не закрануць пытанне аптымізацыі. Ці шмат у вашым "падшэфным" рэгіёне знікла ўстаноў культуры?

Святлана САРОКА:

— Канкрэтную лічбу нельга прывесці, бо працэс аптымізацыі яшчэ не завяршыўся…

Заканчэнне — на старонцы 12.

Кастусь АНТАНОВІЧ:

— І, на жаль, не толькі маладыя…

Святлана САРОКА:

— Так, вельмі важна не згубіць прафесійныя кадры. Хачу прывесці два яскравыя прыклады. У свой час у Маладзечне была адзіная ў краіне фабрыка музычных інструментаў. Сёння на яе аснове працуе невялікае прыватнае прадпрыемства. А вось у Барысаве, дзе доўгі час працавала адзіная фабрыка па выпуску фартэпіяна, на дадзены момант няма ні вытворчасці, ні каштоўных спецыялістаў. А прафесіяналы ж з ніадкуль не з'яўляюцца. Таму, баюся, неўзабаве ўстановы культуры сутыкнуцца з вострай праблемай камплектавання тымі ж музычнымі інструментамі…

Тэлефонны дыялог

Алена РЫБЧЫНСКАЯ, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела сацыяльнай сферы Навукова-даследчага інстытута Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь:

— Ці распрацаваны стандарты якасці паслуг у сферы дзейнасці клубнай установы? Ці існуе методыка перыядычнай ацэнкі патрэбы ў прадастаўленні паслуг у натуральным адлюстраванні і адлюстраванні коштаў? Ці былі спробы ацаніць якасць паслуг з выкарыстаннем індэкса задаволенасці спажыўцоў? У Расіі і Казахстане індэкс актыўна выкарыстоўваюць. У Беларусі ў справаздачах ды планах арганізацый і ўстаноў культуры ёсць абавязковая ўмова — "павышэнне якасці паслуг". А як яе павысіць? Усе кажуць, што варта павялічваць колькасць і разнастайнасць мерапрыемстваў. Але ж якасць — гэта штосьці іншае…

Святлана САРОКА:

— Мы ў сябе штогод праводзім апытанне наведвальнікаў, удакладняем, што іх цікавіць, як нам варта памяняць віды культурных паслуг. Натуральна, людзей вабяць адпачынак, творчасць і відовішча. У гэтых кірунках і стараемся працаваць. Ваша пытанне — вельмі цікавае і карыснае. На яго можна бясконца адказваць. Я вам дашлю адпаведныя канкрэтныя матэрыялы са зместам нашых анкет.

Алена РЫБЧЫНСКАЯ:

— Дзякуй, і яшчэ пытанне: як вы ставіцеся да таго, што ў апошняй рэдакцыі Закону аб культуры знікла ўсё, што датычыцца мастацкай адукацыі? Гаворка — толькі пра эстэтычную. А гэта гуманітарная адукацыя агульнага цыкла…

Святлана САРОКА:

— Я павінна ўсё ўдакладніць і прааналізаваць… Цяпер у Савеце Рэспублікі складаецца рабочая група па падрыхтоўцы Кодэкса аб культуры. Усе слушныя прапановы, што пастаянна паступаюць да мяне, будуць абавязкова ўлічаны і ўнесены ў дакумент.

На людным месцы

Бібліятэка рэкордаў

Менавіта такую можна знайсці ў старажытнай і каларытнай вёсцы Спорава, якая з'яўляецца сталіцай абласнога фестывалю "Спораўскія жарты". Спораўцы — недасяжныя жартаўнікі і людзі з пачуццём уласнай годнасці. Складаюць анекдоты, смешныя гісторыі, байкі, гавораць на спораўскай мове, прыдумалі свой герб, грошы, пабудавалі скульптуру "Спаравец і Спароўка", пішуць "Кнігу рэкордаў і ўнікумаў вёскі Спорава", актыўна чытаюць.

БЯРОЗАЎШЧЫНА

Ні адна бібліятэка ў раёне не можа пахваліцца такой колькасцю інфармацыйнага матэрыялу аб сваёй вёсцы, яе прыродным багацці — Спораўскім заказніку, народных умельцах. Два выпускі літаратурна-мастацкага выдання "Спорава і спараўцы", выдадзеных ў 1990-я двухтысячным тыражом, сёння — ужо рарытэт. Толькі ў Спораўскай бібліятэцы вам пакажуць карту кампактнага пражывання спораўцаў "Спаравец ідзе па свеце", складзеную чытачамі, якая называе адрасы землякоў па прозвішчах Жуковіч, Пракурат, Пашкевіч, Бруйла, Казека, Аполька ў ЗША, Ірландыі, Афрыцы, Італіі, Германіі, Ізраілі, не кажучы пра бліжняе замежжа.

Мясцовай бібліятэцы споўнілася 65 гадоў. На юбілейны вечар прыехалі былыя бібліятэкары, кіраўнікі-ветэраны бібліятэчнай справы, дырэкцыя і работнікі Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы. Іх успаміны пра драўляную хату-чытальню, якая стаяла на беразе Спораўскага возера, пра вялікі інтарэс да кнігі колішняй моладзі, пра кніганошаў зрабілі сустрэчу цёплай, непаўторнай.

Сёння камп'ютарызаваная ўстанова задавальняе інфармацыйна-дасугавыя запыты жыхароў аграгарадка "Спораўскі", дзе пражывае звыш тысячы чалавек, з якіх кожны трэці чытае. "Візітоўкай" бібліятэкі з'яўляецца Эколага-асветніцкі цэнтр "Ведай. Любі. Беражы" і краязнаўчы куток "Соль зямлі Спораўскай". Актыўны чытач-спаравец штогод наведвае сваю бібліятэку восем — дзевяць разоў, знаходзіць час, каб прачытаць 23 — 25 кніг, не менш як пяць разоў завітвае на бібліятэчныя мерапрыемствы, актыўна ўдзельнічае ў конкурсах, акцыях…

На юбілейным вечары былі адзначаны чытачы-рэкардсмены: сям'я з пятнаццаці чалавек Віктара і Марыі Пракуратаў, уладальніца намінацыі "Розуму палата" Тамара Водзіч, лідары дзіцячага чытання — навучэнцы чацвёртага класа сярэдняй школы з класным кіраўніком Нінай Міхайлаўнай Бузюма, кнігалюб са шматгадовым чытацкім стажам перыёдыкі Іван Чайчыц. Пенсіянерка Вольга Пашкевіч за саракапяцігадовую адданасць бібліятэцы і кнізе ўзнагароджана ў намінацыі "Першая ластаўка". Званнямі "Міс жаночы раман", "Бібліямарафонец", "Містар гістарычны раман" адзначаны кнігалюбы Алена Пракурат, Таццяна Пашкевіч, Віктар Агрэніч адпаведна.

У экалагічным цэнтры Спораўскай бібліятэкі.

Спораўская бібліятэка — адзіная ў раёне, дзе прафесія бібліятэкара стала сямейнай. Шмат добрых слоў пачула Алена Міхайлаўна Жуковіч, якая 39 гадоў працавала вясковай асветніцай, вывела ўстанову ў лідары, ейнае імя было занесена на раённую Дошку гонару. Два гады таму марафонскую эстафету бабулі падхапіла яе ўнучка-цёзка — дваццацідвухгадовая Алена Жуковіч, студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Гэтае святочнае мерапрыемства яна на "выдатна" правяла сумесна з калектывам Спораўскага цэнтра культуры і вольнага часу, які адзначаны ў намінацыі "Палачка-выручалачка".

Прысутных у зале сагрэлі праменьчыкі таленту дзяцей з аматарскага аб'яднання "Іскарка", якія прадставілі Тэатр праваслаўнай кнігі "Тры сястры". Юныя прыродалюбы з клуба "Праменьчык" падрыхтавалі касцюмаванае дзейства "Царэўна-жаба на новы лад". У цішы глядзелі і стары і малы мультымедыйны слайд-круіз "Жывецца здорава ў чытаючым Спораве".

А дырэкцыя ЦБС падарыла спораўскім чытачам акварыум з пажаданнем, каб у будучым кнігалюбы ўпісалі ў сваю "Кнігу рэкордаў" яшчэ адно дасягненне — гаворачую рыбку…

Калі прыгадаць байку, што жыхары Спорава садзяць бульбу ўначы, каб каларадскі жук не бачыў, дык усё магчыма!..

Ала ДРАГАН, загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Бярозаўскай ЦРБ
Фота Галіны КРЫВАШЭЕВАЙ

Установа культуры: пошукі рэцэпту запатрабаванасці

На пытанні чытачоў і журналістаў "К" адказвае сенатар Святлана САРОКА

(Заканчэнне. Пачатак на старонках 10 — 11.)

У сувязі з аптымізацыяй сеткі публічных бібліятэк, звязанай з памяншэннем колькасці сельскага насельніцтва, назіраецца штогадовае скарачэнне колькасці бібліятэчных устаноў. У маланаселеных пунктах закрываюцца сельскія бібліятэкі, або працуюць на 0,5 і 0,25 стаўкі.

Гэты працэс неадназначна ўспрымаецца як работнікамі ўстаноў культуры, што закрываюцца, так і жыхарамі тых населеных пунктаў, дзе адбываюцца гэтыя працэсы. У сувязі з гэтым, значна павялічваецца плынь зваротаў-скаргаў у розныя інстанцыі. Ні для каго не сакрэт, што для забеспячэння жыхароў такіх вёсак паслугамі культуры арганізавана работа аўтаклубаў і бібліобусаў. Нельга назваць гэта раўнацэннай заменай, аднак у дадзеным выпадку ўсё залежыць ад граматнай арганізацыі працы. Тым больш, аўтабібліятэкі, як паказала практыка, з'яўляюцца вельмі эфектыўнай і дзейснай формай абслугоўвання насельніцтва... Разам з тым, існуюць пэўныя цяжкасці: у сваёй большасці аўтамабілі не маюць як бібліятэчнага, так і тэхнічнага абсталявання. Літаратура перавозіцца ў скрынках, што ўскладняе працу з ёй…

Кастусь АНТАНОВІЧ:

— Наколькі рэальна сельскай установе культуры змяніць сваю назву на, скажам, Дом лозапляцення?

Святлана САРОКА:

— А чаму б і не? Гэта новыя тыпы клубных устаноў. У краіне маецца шмат добрых прыкладаў. Ужо даўно дзейнічаюць дамы фальклору, этнаграфічныя ўстановы. Усё залежыць ад мясцовых культурных традыцый ды ініцыятывы работнікаў культуры.

Кастусь АНТАНОВІЧ:

— Ці не ва ўсім свеце ўстановы культуры актыўна карыстаюцца магчымасцямі фінансавання сваіх праектаў праз гранты. А што ў гэтым плане робіцца ў нас?

Святлана САРОКА:

— Айчынныя ўстановы культуры могуць прыняць удзел як у конкурсе мясцовых, раённых грантаў, так і рэспубліканскіх, а таксама міжнародных. У маім родным раёне ўстановы культуры і нават калектывы неаднаразова атрымлівалі гранты на вырашэнне транспартных пытанняў, тэхнічнае абсталяванне. Гэта вялікая падтрымка, стымул для развіцця. А вось да міжнародных грантаў айчынныя ўстановы культуры звяртаюцца з насцярогай, у тым ліку з-за асаблівасцей афармлення дакументаў. Як адзначыў мой калега з Польшчы, у краінах Еўрасаюза дзейнічаюць і запатрабаваны фірмы, якія на платнай аснове аказваюць паслугі па афармленні дакументаў, бо складці поўны пакет дакументаў без вопыту, самастойна вельмі праблематычна.

Яўген РАГІН:

— Далікатнае пытанне. Не прынята казаць услых, колькі ў краіне сем'яў, дзе жонка — супрацоўнік Дома культуры, распалася з-за працы. Хто, як не вы, разумее, што ім часам даводзіцца суткамі працаваць у сваіх установах, каб як след падрыхтавацца да мерапрыемства…

Святлана САРОКА:

— Калі чалавек вырашае працаваць у культуры, то павінен разумець спецыфіку працы. Гэтае ж мусіць разумець і той, хто хоча стварыць з ім сям'ю. Мы працуем, каб іншыя адпачывалі. А таму даводзіцца быць ва ўстанове і па вечарах, і ў выхадныя дні. Многія не разумеюць гэтага. Часам і мне даводзілася чуць такія скаргі ад мужоў супрацоўніц нашай установы.

Кастусь АНТАНОВІЧ:

— Пад час нашага аўтападарожжа па рэгіёнах краіны звярнуў увагу на афармленне шыльдаў з найменнямі ўстаноў культуры: шмат дзе была прадстаўлена толькі руская мова. Што на гэты конт кажа заканадаўства?

Святлана САРОКА:

— Раней пры афармленні шыльдаў дзяржаўных устаноў заканадаўства прадугледжвала выкарыстанне абедзвюх моў паралельна. Сёння можна выкарыстоўваць адну з іх на выбар. Я лічу, што ўсе шыльды павінны афармляцца на беларускай. І не толькі ўстаноў культуры. Хто, як не мы, работнікі культуры, прадстаўнікі СМІ, будзе захоўваць родную мову? Як тут не прыгадаць словы народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча: "Няма мовы — значыць, ты без роду, няма мовы — значыць, ты нямы…".

Пытанні з электроннай пошты і сацыяльных сетак

— Ці могуць бібліятэкары і тыя ж клубныя работнікі, згодна з заканадаўствам, праводзіць экскурсіі па мясцовых славутасцях? Мяркую, гэта дапаможа павялічыць турыстычны патэнцыял сельскіх устаноў культуры…

Святлана САРОКА:

— Магчыма расчарую вас, але спецыялісты сельскіх устаноў культуры могуць праводзіць экскурсіі, у тым ліку па мясцовых славутасцях, толькі пры наяўнасці адпаведнага сертыфікату, для атрымання якога неабходна скончыць курсы пры Нацыянальным агенцтве па турызме. І хоць у рамках службовых інструкцый бібліятэкары мусяць праводзяць розныя формы сацыякультурных мерапрыемстваў, сярод якіх — і краязнаўчыя падарожжы, апошнія нельга лічыць экскурсіямі.

Разам з тым, сельскі турызм у поўнай меры можа выкарыстоўваць увесь арсенал паслуг, якія прапануюць установы культуры. Найбольш цікавы вопыт профільных устаноў — дамоў і цэнтраў рамёстваў, фальклору, ткацтва, многія з якіх ужо знайшлі сваю нішу ў сферы турыстычнага абслугоўвання. Напрыклад, Красоўшчынскі дом рамёстваў Маладзечанскага раёна ўключаны ў рэспубліканскі турыстычны маршрут. Выгаднае становішча гэтай установы, побач з трасай Мінск — Нарач дазволіла адкрыць на яе базе салон-магазін па продажы твораў народных майстроў, рэгулярна праводзіць адмысловыя майстар-класы.

— Святлана Рыгораўна, назавіце, калі ласка, найбольш актуальныя клопаты ўстаноў культуры ў глыбінцы і магчымасці іх вырашэння.

Святлана САРОКА:

— Натуральна, сельскі Дом культуры не можа раўняцца з Вялікім тэатрам оперы і балета, але, я пераканана, і ў сельскай установе культуры можна і неабходна ладзіць свае цікавыя ды запатрабаваныя мерапрыемствы...

Менавіта ад мастацкага густу, творчага стаўлення да працы, жадання або нежадання пошуку крэатыўных рашэнняў залежыць стан і дынаміка культуралагічных працэсаў у рэгіёнах. На жаль, у некаторых раёнах назіраецца працэс стагнацыі, калі кіраўнікі недастаткова звяртаюць увагу на развіццё аматарскай творчасці і ўзровень творчых калектываў. Неабходны крэатыўныя падыходы да фарміравання новага, сучаснага эканамічнага механізма функцыянавання ўстаноў культуры ў глыбінцы.

Мы не павінны праводзіць фестывалі для ўдзельнікаў гэтых фестываляў. Трэба зрабіць такі прадукт культурнай дзейнасці, які будзе запатрабаваны гледачом, мае садзейнічаць не толькі развіццю аматарскай творчасці, але і прыцягне турыстаў ды стане адной з крыніц пазабюджэтных паступленняў. А таму кожны раён павінен мець свой "брэнд", сваю "візітоўку".

— Пад час летняга адпачынку сутыкнуўся з прыкрай сітуацыяй, калі загадчыца сельскай бібліятэкі прадэманстравала сваю прафесійную некампетэнтнасць. Як высветлілася, у яе не было ні вышэйшай, ні сярэдняй спецыяльнай адукацыі…

Святлана САРОКА:

— Адразу скажу: некваліфікаваныя спецыялісты прымаюцца на работу толькі ў тым выпадку, калі няма магчымасці знайсці спецыяліста з бібліятэчнай адукацыяй. І тое — пры ўмове далейшай перакваліфікацыі. Падобная сітуацыя больш характэрна для некаторых маланаселеных, аддаленых вёсак. Калі ж звярнуцца да лічбаў, то сёння ў сельскіх бібліятэках Мінскай вобласці працуе звыш 700 бібліятэкараў, з іх 75% маюць вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю. У цэлым па краіне забеспячэнне прафесійнымі кадрамі ўстаноў галіны прыносіць свае вынікі, але ж і не так хутка, як хацелася. Так, забяспечанасць прафесіяналамі дасягнула 89% супраць 88,5% у мінулым годзе. У сваю чаргу, для павышэння прафесійнага ўзроўню бібліятэчных работнікаў ва ўсіх цэнтральных раённых бібліятэках пры аддзелах бібліятэчнага маркетынгу створаны "Школы маладых бібліятэкараў", "Школы пачынаючых бібліятэкараў", "Школы прафесійнага майстэрства".

Журналісцкія камандзіроўкі бываюць і цікавыя, і сумныя. Паездкі "К" на Рагачоўшчыну трапляюць у лік першых. І гэта тлумачыцца тым, што мясцовыя работнікі культуры даўно і стала займаюцца праектнай дзейнасцю, а грошы для рэалізацыі нестандартных ідэй знаходзяць самі. Лепшага доказу творчай самадастатковасці і не прыгадаць. Гэта і стымулюе пастаянны журналісцкі інтарэс. У выніку з'яўляюцца публікацыі, карысныя, як нам падаецца, для росту самадастатковасці іншых аддзелаў.

Стратэгія начальніка аддзела

Альтэрнатыва дыскатэцы

Міхаіл ЗАЙЦАЎ, Рагачоўскі райвыканкам:

— На еўрасаюзаўскі грант, скіраваны на развіццё сельскіх тэрыторый, мы набылі аўтаклуб, абсталяваны па апошнім слове тэхнікі. Ён сёння — на маршрутах і абслугоўвае маланаселеныя пункты раёна. Пра гэты праект "К" пісала на пачатку года. З таго часу мы выйгралі яшчэ грант: па экалогіі. А гэта — 50 тысяч еўра. Сума пойдзе на ўзнаўленне Кісцянёўскага парку, што знаходзіцца ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей. Аб'ект абяцае стаць у перспектыве адной з турыстычных цікавостак Рагачоўшчыны.

З ідэалагічнага пункта гледжання, адным з самых важных клопатаў з'яўляюцца выбары дэпутатаў у мясцовыя Саветы. Для падтрымкі гэтай кампаніі мы заўжды прыцягвалі і прыцягваем самыя лепшыя сілы аддзела.

Дыскатэка не карыстаецца цяпер ранейшым попытам. Сёння шукаем альтэрнатыву ў выглядзе карпаратыўных вечароў адпачынку. Але добрую забаўляльную праграму не зробіш без сучаснай апаратуры. Апошнім разам тую тэхніку наш аддзел закупляў ажно ў 2004 годзе. І гэта праблема.

Апрача праектнай і ідэалагічнай дзейнасці, займаемся, натуральна, і бягучым клопатам, вядомым кожнаму аддзелу ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі. На наш баланс перадалі клуб завода "Дыяпраектар", дзе зала — на 400 месцаў. Стан установы — не з лепшых. Сёлета мы тут распачалі рамонт: зрабілі палову даху, прыкладна на семдзесят працэнтаў замянілі вокны, дзверы… Праблема — з ацяпленнем. Вырашаем яе цяпер разам з Галоўным упраўленнем Гомельскага аблвыканкама і нашым райвыканкамам. Гаворка ідзе аб выдаткаванні грошай на далейшы рамонт даху, аварыйнай глядзельнай залы і на падключэнне цэнтральнага ацяплення. А сума на гэта спатрэбіцца немалая: каля двух мільярдаў рублёў. Але ўсе цудоўна разумеюць важнасць вырашэння пытання, таму ёсць спадзеў, што ўстанова не трапіць у лік даўгабудаў...

На мой погляд, дыскатэка не карыстаецца цяпер ранейшым попытам. Прычына — у дэмаграфіі. Сёння шукаем альтэрнатыву гэтым мерапрыемствам. Думаю, што больш якаснымі, частымі і разнастайнымі павінны стаць сацыяльна-творчыя заказы, да прыкладу, карпаратыўныя вечары адпачынку. Але добрую забаўляльную праграму, як цудоўна вядома, не зробіш без сучаснай гука — светлавой апаратуры. А апошні раз гэтую тэхніку наш аддзел закупляў ажно ў 2004 годзе. І гэта — таксама праблема.

Радуе тое, што цяпер на галоўнае месца ставіцца не колькасць клубных гурткоў, а іх якасць. Інакш кажучы, ёсць разуменне таго, што людзей у раёне не прыбаўляецца. І не самае галоўнае, колькі ўдзельнікаў у фарміраванні, больш значным падаецца тое, з якім вынікам яно працуе, як раскрывае талент вяскоўцаў, як ашчаджае іх душу. А гэта — таксама ідэалогія.

Удакладненне

У "К" № 45 ад 9 лістапада ў артыкуле "Калі ж вы нас маркетынгу навучыце?" імя і прозвішча супрацоўніцы Брэсцкай абласной бібліятэкі імя Максіма Горкага трэба чытаць так: Алена Васілечка. Перапрашаем!

Натуральны адбор: фактар музея

“Хто вам сказаў, што мы — кансерватары?”

Здавалася б, музеі вырачаны на Сізіфаву працу: спыніць няўмольны бег часу. Ды, як высветлілася, яны самі аказаліся яму падуладныя. На Беларусі гэтыя павевы адчувальныя ўсё мацней: анімацыйнымі праграмамі, інтэрактыўнымі “фішкамі” або проста “немузейнымі” імпрэзамі ў сценах музея ўжо не здзівіць.
Ці мае такі трэнд паўсюдны характар і ці не зменіць ён самой сутнасці музейнай справы? Гэтыя пытанні карэспандэнт “К” адрасаваў эксперту — генеральнаму дырэктару Дзяржаўнага цэнтральнага музея сучаснай гісторыі Расіі Сяргею АРХАНГЕЛАВУ.

Сяргей АРХАНГЕЛАЎ, дырэктар Дзяржаўнага цэнтральнага музея сучаснай гісторыі Расіі

— У сценах установы ўжо двойчы праходзілі выстаўкі сучаснага беларускага мастацтва...

— І не толькі беларускага, але таксама і сербскага, славацкага, балгарскага... Нам важна адлюстроўваць тую мяжу, што аддзяляе сучаснасць ад гісторыі, — мяжу даўжынёй літаральна ў адно імгненне. І менавіта таму нам цікавыя тыя выставачныя праекты, якія дазваляюць зірнуць на ход цывілізацыйных падзей як бы ў іншым ракурсе — мастацкім.

— Сучаснае мастацтва — амаль заўсёды “спрэчнае”. Мы прызвычаіліся, што музей абвяшчае “непахісныя ісціны”...

— Каб наш музей меў палеанталагічны або археалагічны профіль, такі падыход быў бы заканамерным. Аднак у нас іншая тэматыка — сучасная гісторыя.

— А хіба музей не з’яўляецца ўстановай кансерватыўнай — ужо па сваёй прыродзе?

— Хто вам гэта сказаў? Асабіста мне імпануе іншы падыход. Па словах дырэктара Эрмітажа і прэзідэнта Саюза музеяў Расіі Міхаіла Піятроўскага, музеі — гэта інстытуты грамадзянскай супольнасці. Таму іх роля сёння, мабыць, яшчэ не да канца ацэнена. Дарэчы, ці ведаеце, колькі наведвальнікаў маюць расійскія музеі штогод? Каля васьмідзесяці мільёнаў чалавек! Больш, чым бібліятэкі і тэатры, разам узятыя. Гэта сведчыць пра той патэнцыял, што маюць музеі як установы, у якіх сканцэнтраваны дасягненні, думкі, намеры, ілюзіі — усё, што суправаджае чалавека на гістарычных пуцявінах. Не скарыстацца такім патэнцыялам — грэх. Але для гэтага музей мусіць умець папулярызаваць тыя набыткі, што ён збірае і захоўвае.

Пад час аднаго з праектаў музея.

— Ці не боязна, што функцыя папулярызацыі стала прэваляваць?

— Не так даўно давялося пабываць на Генеральнай канферэнцыі ICOM у Рыа-дэ-Жанейра, якая сабрала каля 3 500 музейшчыкаў са 150 краін. І ведаеце, пра што там у першую чаргу вялася гутарка? Менавіта пра змаганне за наведвальніка. У прыярытэтнасці гэтай задачы музейшчыкі з усяго свету нават не сумняваюцца, абмяркоўваліся хіба самі спосабы яе вырашэння, скажам, пошукі новых форм падачы матэрыялу...

— Толькі што агледзеў вашу экспазіцыю, прысвечаную перыяду распаду СССР. Гэта і сапраўды новая форма: замест статычных стэлажоў — мультымедыйнае шоу!..

— Гаворка — акурат пра той перыяд, які выяўляе няўлоўнасць мяжы паміж гісторыяй і цяперашчынай. Разумееце, адна справа, калі мы выстаўляем, скажам, акамянелыя косткі дыназаўраў: іх трэба ідэнтыфікаваць, а потым проста змясціць у вітрыну і забяспечыць этыкеткай. І зусім іншая — адлюстраванне тых падзей, якія мы з вамі самі перажылі і цудоўна памятаем. Трэба ўлічваць, што амаль кожны наведвальнік (за выключэннем хіба самых маладых) мае да іх сваё стаўленне, яны нейкім чынам “наклаліся” і на яго асабістую гісторыю. Адпаведна, гэтую экспазіцыю нельга рабіць аб’ектыўна-безадноснай, статычнай. І мы прыўносім у яе нават элементы гульні з наведвальнікам, правакуючы яго на ўласныя ўспаміны ды эмоцыі.

— Ці ўдаецца завабіць моладзь у вашы сцены?

— А вы прыходзьце на нашы мерапрыемствы — і самі ўсё ўбачыце. Гэта дыскусійныя клубы, “круглыя сталы” для тых, хто цікавіцца гісторыяй. А яшчэ лепш прыйсці ў Ноч музеяў. Дынаміка росту інтарэсу моладзі да музеяў — станоўчая. Завабіць яе да нас — цікавая і творчая работа, якая патрабуе неардынарных рашэнняў. Думаецца, выконваць яе павінны таксама маладыя людзі — музейшчыкі новага пакалення, якія маюць сваё бачанне прафесійнай дзейнасці. У нашай камандзе такіх не бракуе.

— Хіба праблемы з кадравым папаўненнем у вас няма?

— Не зусім так. На пасады навуковых супрацоўнікаў мы бяром толькі людзей з вышэйшай гістарычнай адукацыяй, а вось спецыяльныя кадры для нас ніхто не рыхтуе. У Інстытуце культуры ёсць кафедра музеялогіі, аднак яна выпускае “спецыялістаў шырокага профілю”. Але ж профіль розных музеяў вельмі адрозніваецца. Адна справа — гістарычны, і зусім іншая — скажам, мастацкі або інжынерны. У кожным з выпадкаў патрэбны свой багаж ведаў.

— Прэстыжнасці прафесіі павінен спрыяць і “меркантыльны фактар”...

— Заробак супрацоўнікаў нашых філіялаў у Смаленскай і Цвярской абласцях перавышае сярэдні ўзровень у сваіх рэгіёнах. У Маскве сітуацыя пакуль трохі горшая: 82% ад сярэдняга заробку ў сталіцы. У наступным годзе мы абавязаны выправіць гэтую сітуацыю.

— А якім чынам гэта можна зрабіць у нерэнтабельнай бюджэтнай установе?

— Агульная схема такая: мы прыдумваем новы праект (экспазіцыю, выстаўку, міжмузейны абмен і г. д.), прапаноўваем гэтую задуму заснавальніку — Міністэрству культуры Расійскай Федэрацыі, — абараняем яе. І ў выпадку поспеху атрымліваем мэтавае фінансаванне. Прыкладам, налета маем правесці дзве міжнародныя выстаўкі, прысвечаныя сотым угодкам пачатку Першай сусветнай вайны, — і гэтыя праекты ўжо адобраны. Натуральна, у іх каштарыс уключаны таксама і фонд заработнай платы. Тыя супрацоўнікі, якія будуць непасрэдна задзейнічаны ў рэалізацыі, патрацяць энергію і дадатковы час не на філантрапічных пачатках.

— Чым больш цікавых праектаў, тым большы заробак?

— Менавіта так. І гэтая схема дазваляе самому жыццю зрабіць натуральны адбор.

— Апошнім часам у музейнай сферы значна актывізавалася прыватная ініцыятыва з выразным камерцыйным прысмакам: з’яўляюцца музеі агурка, перніка, самавара... Як належыць ставіцца да гэтай з’явы прафесіяналам?

— Толькі станоўча, асабліва калі такія музеі з’яўляюцца не на пустым месцы, а адлюстроўваюць старадаўнія рэгіянальныя традыцыі ды спрыяюць іх захаванню. Прыкладам, непадалёк ад Яраслаўля ёсць сяло Вяцкае, якое здавён лічылася “агурковай сталіцай”. Клімат там для гэтага спрыяльны: туманы... Ды і людзі спаконвек былі вельмі прадпрымальныя ды працавітыя. І вось, ужо ў наш час, адзін заможны чалавек вырашыў набыць там сабе старадаўнюю камяніцу, адрэстаўраваў яе. У Вяцкім яму спадабалася, і ён набыў другі дом — пад гатэль. Потым сама сабой з’явілася ідэя стварыць музей. Цяпер музеяў там ужо каля дзесяці, самай рознай тэматыкі. Яшчэ нядаўна Вяцкае было звычайным сялом з перспектывамі такімі ж туманнымі, як і сам гэты край. Але турыстычны бум стварыў новыя працоўныя месцы, спарадзіў шматлікія інвестыцыі, у тым ліку — і ў рэстаўрацыю гістарычнай забудовы. Адным словам, сяло ажыло. А ўсё пачыналася менавіта з музея!..

Ілья СВІРЫН,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Масква — Мінск

Рэйтынг ідэй з internet-прасторы

Віртуальны набор для экспазіцыі

Перадаюць і захоўваюць гісторыю, сярод іншых інстытуцый, краязнаўчыя музеі. Дырэктар аднаго з іх распавёў пра магчымасці Інтэрнэту.

Аляксей МІЦЮКОЎ, дырэктар Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея

1. Музеі

Мяне як дырэктара музея, натуральна, цікавіць, што новага адбываецца ў калег, якія праходзяць выставачныя праекты і мерапрыемствы. Існуе добры партал, да якога рэгулярна звяртаюся — www.museum.by, — дзе прадстаўлена інфармацыя аб музеях краіны. Але, на жаль, не ўсе ўстановы абнаўляюць інфармацыю на старонках своечасова, а для сучаснасці аператыўнасць мае вялікае значэнне. Маем і свой сайт — brokm.vbreste.by, — дзе размяшчаем інфармацыю пра музей, пра яго філіялы, даём апісанне калекцый, рэгулярна абнаўляем стужку навін ды многае іншае.

2. Зваротная сувязь

Акрамя навін на сайце, робім запыты на прадметы, у набыцці якіх зацікаўлены. Да прыкладу, зараз рыхтуем экспазіцыю, прысвечаную 20-м гадам мінулага стагоддзя. З гэтай нагоды размясцілі інфармацыю, што ў сувязі са стварэннем экспазіцыі музей зацікаўлены ў набыцці тэлефона польскай вытворчасці 1920 — 30-х. Такім чынам, Інтэрнэт дае магчымасць працаваць у двухбаковым рэжыме: ты не толькі даеш інфармацыю для чытачоў, але і можаш нешта за яе атрымаць.

3. Прыклады

Праглядаем сайты польскіх, нямецкіх, шведскіх музеяў, вывучаем, як у іх арганізавана праца ў інтэрнэт-прасторы. Многія пабудаваны па такім жа прынцыпе, як і нашы: выкладваецца інфармацыя пра музей, навіны, артыкулы, у некаторых можна ўбачыць альбом са здымкамі, што, дарэчы, вельмі добра, бо на нашых сайтах бракуе менавіта фатаграфій. Да прыкладу, на старонцы аднаго рэгіянальнага польскага музея навіны прадстаўлены кароткім аглядам мерапрыемстваў і вялікай колькасцю здымкаў.

4. Гісторыя і сучаснасць

Па краязнаўчай справе праглядаю сайты, звязаныя з гісторыяй Брэстчыны. Ёсць цікавы — www.ibrest.com, які змяшчае навіны, дакументы, здымкі XIX — XX стагоддзяў, інфармацыю пра знакавых постацей мінуўшчыны ды іншае. Для гісторыкаў, краязнаўцаў гэта павінна быць цікава. Акрамя таго, там ёсць форум, дзе абмяркоўваюцца гістарычныя, музейныя тэмы. Такім чынам можна праводзіць свайго роду маніторынг і высвятляць меркаванні наведвальнікаў аб музеях, іхнія пажаданні ці незадаволенасць.

5. Аўкцыёны

Калі закранаць прафесійную сферу, то адзін з галоўных кірункаў працы музея — гэта збор прадметаў музейнага значэння ды камплектаванне фондаў. Для гэтага, акрамя закупак і экспедыцый, супрацоўнікі адсочваюць інтэрнэт-аўкцыёны, што дапамагае быць у курсе падзей наконт пошуку рарытэтаў, дае магчымасць параўноўваць кошты, выяўляць інтарэсы. І калі людзі прыносяць у музей прадмет на закупку, мы можам ацаніць яго самастойна, абапіраючыся на інфармацыю, якую бачым у Сеціве. Аўкцыёнаў мноства: як агульнай скіраванасці, напрыклад, www.ay.by, так і спецыялізаваныя — мастацтвазнаўчыя або ваеннай тэматыкі.

Занатавала Вольга НАВІЦКАЯ

Не падфарбоўвайце старажытны роспіс,

бо “макіяж” цяжка змыць…

Субрэгіянальны семінар рэстаўратараў, арганізаваны Беларускай дзяржаўнай акадэміяй мастацтваў пры падтрымцы UNESCO, у якім узялі ўдзел рэстаўратары Беларусі, Польшчы і Літвы, праходзіў у Нясвіжы. І сцвердзіла падзея чарговы раз, што нацыянальная школа рэстаўрацыі на сённяшні дзень знаходзіцца толькі на стадыі станаўлення: пакуль больш пытанняў ды праблем, чым дасягненняў.

Пад час рэстаўрацыйных майстар-класаў у Нясвіжы.

З прычыны таго, што ВНУ рэспублікі не рыхтавалі спецыялістаў па рэстаўрацыі твораў мастацтва, работы часта адпраўляліся на рэстаўрацыю ў бліжняе замежжа. Сёлета ў Акадэміі мастацтваў першае пакаленне прафесійных рэстаўратараў, у аснове навучання якіх ляжыць мастацкая акадэмічная адукацыя і асваенне рэстаўрацыйных тэхналогій, ужо выйшла на свае дыпломныя праекты. Праблематыка ў гэтай галіне становіцца відавочнай, калі маеш магчымасць пагутарыць з калегамі з краін-суседак, параўнаць вынікі, ацаніць іх шматгадовы досвед у захаванні спадчыны.

Падзеяй для студэнтаў Акадэміі стала правядзенне семінара рэстаўратараў на гістарычнай пляцоўцы Нясвіжскага палацава-паркавага комплексу. Былі запрошаны вядучыя спецыялісты наймацнейшых рэстаўрацыйных школ Польшчы і Літвы. Некаторыя з іх — вядомыя грамадскія дзеячы, як, напрыклад, Славамір Ратайскі — генеральны сакратар Польскай Нацыянальнай камісіі па справах UNESCO. Ён доўгі час служыў паслом у Лацінскай Амерыцы, а цяпер з’яўляецца загадчыкам кафедры выяўленчых мастацтваў факультэта медыя-мастацтва і сцэнаграфіі Акадэміі прыгожых мастацтваў у Варшаве. Адзначым, што сярод гасцей былі і тыя, хто добра знаёмы з беларускім мастацтвам, займаўся рэстаўрацыяй касцёлаў, Нясвіжскага замка.

У перыяд правядзення семінара было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве з варшаўскай Акадэміяй прыгожых мастацтваў. У галерэі БДАМ выстаўляліся асістэнты-стажоры польскай Акадэміі. Беларускія ж студэнты ўдзельнічалі ў стварэнні манументальных аб’ектаў на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства. І зараз беларускі бок разлічвае на яшчэ больш актыўныя формы супрацоўніцтва: правядзенне лекцый, выставак, майстар-класаў.

Семінар рэстаўратараў у Нясвіжы: эксперты падзяліліся вопытам

Пра перспектывы супрацоўніцтва распавёў рэктар БДАМ Міхаіл Баразна: “Для нас вельмі важнае развіццё рэстаўрацыйнага аддзялення, таму субрэгіянальны семінар праводзіўся ў Нясвіжы на высокім узроўні. Нам неабходны падобныя мерапрыемствы, дзе адпрацоўваюцца метадычныя падыходы ў галіне рэстаўрацыі. У рамках міжнароднай дзейнасці падпісаны пагадненні па падрыхтоўцы нашых спецыялістаў венскай Акадэміяй дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, пражскай Акадэміяй, абмяркоўваліся пытанні супрацоўніцтва са Строганаўскай архітэктурна-мастацкай акадэміяй, Акадэміяй мастацтваў у Заграбе (Харватыя). Мы і надалей будзем весці пошук эфектыўных шляхоў супрацоўніцтва з калегамі за мяжой”.

На семінары абмяркоўваліся прафесійныя пытанні. Напрыклад, праблема даўняга канфлікту паміж жаданнем недасведчаных бачыць выразны прыгожы вобраз у роспісе і жаданнем рэстаўратара бачыць толькі гістарычна каштоўны пласт без паднаўлення. Тут трэба ўлічваць функцыянальнае прызначэнне аб’екта і ісці на кампрамісы. “Клопат” непрафесіяналаў часам прыводзіць да недарэчнага перфекцыянізму, і пасля падфарбоўвання знікаючага абраза рукой якога-небудзь мясцовага майстра роспіс пачынае выглядаць ідэальна, як толькі што напісаны, — адпаведна, знікае яго аўтэнтычнасць. Калі на вуліцы сустракаюцца пажылыя людзі, якія, жадаючы выглядаць прыгажэйшымі і маладзейшымі, нанеслі безгустоўна яркі макіяж, — у мінакоў гэта выклікае ўсмешку, ці ж не так? У той час як падфарбоўванні на старажытным роспісе чамусьці для многіх прымальныя, хаця гэты “макіяж” змыць цяжэй.

Сустракаецца і грубае ўмяшальніцтва цывілізацыі: вокны ПВХ у касцёлах, кабелі і шчыткі з пажарным абсталяваннем. Гісторыя ведае прыклады, калі электрычныя кабелі бяздумна праводзілі нават праз выдатныя фрэскі Джота... У гэтых выпадках стаіць задача аховы помнікаў ад слядоў дзейнасці сучаснага чалавека праз граматныя інжынерныя рашэнні.

Разглядаліся на семінары і асаблівасці лазернай ачысткі твораў жывапісу, скульптуры, тэкстылю як больш далікатнага метаду ў параўнанні з механічным.

У некаторых выпадках, калі аснову твора нельга аднавіць, няхай гэта будзе крохкая тынкоўка ці сточаная шашалем дошка, роспіс пераносяць на іншую. Гэта лічыцца адным з самых працаёмкіх працэсаў, але часам звярнуцца да яго — адзіная магчымасць уратаваць твор. Так былі данесены да нас многія грэчаскія фрэскі, якія пацярпелі пад час затаплення, так ратуюць ляўкасы, што прыходзяць у заняпад... У Польшчы з прычыны змяншэння колькасці вернікаў актуалізавалася праблема спусцелых касцёлаў, і перанясенне фрэсак на тэкстыль дае ім шанец на жыццё ў музеі.

Дні, праведзеныя ў палацавай атмасферы, сталі святам для студэнтаў. Семінар быў важны для набыцця досведу ў даследаванні, спасціжэнні майстэрства, для асэнсавання прафесіі. Цікавым гэты час стаў і для гасцей, бо яны адкрылі для сябе раней невядомыя ім старонкі гісторыі Беларусі. Першы дзень правялі ў Мінску, наведаўшы калег, Акадэмію мастацтваў, Вялікі тэатр. Была паездка ў Мірскі замак, у Навагрудак, дзе нарадзіўся Адам Міцкевіч.

Ужо развітваючыся з беларускімі студэнтамі, польскія эксперты выказвалі надзею на тое, што калі-небудзь будзе магчымасць сумесна папрацаваць над захаваннем беларускіх помнікаў мастацтва. У пажаданне маладому пакаленню загадчык кафедры рэстаўрацыі мастацкага тэкстылю варшаўскай Акадэміі прафесар Хелена Хрышко сказала: “Не мае значэння, ці станеце вы добрымі спецыялістамі. Галоўнае — любіце сваю працу, і тады не зможаце імі не стаць”.

Ганна КЛІМЕНКА, выкладчык кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва БДАМ

Эпізод, што стаў панарамай

Пра Першую сусветную з дачыненнем да Беларусі

11 лістапада, у Міжнародны дзень памяці загінулых у Першай сусветнай вайне, адбылася прэзентацыя новай кнігі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За духоўнае адраджэнне” Вячаслава Бандарэнкі “Героі Першай сусветнай”. Яна прайшла ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і была прымеркавана да 95-й гадавіны з дня заканчэння Першай сусветнай вайны.

Прадстаўляючы свой твор, аўтар назваў прычыны напісання кнігі. Па-першае, гісторыя Першай сусветнай надзвычай цікавая. Па-другое, падзеі гэтай вайны адбіліся на лёсах многіх беларускіх сям’яў. Па-трэцяе — неаплатны доўг памяці палеглым за Айчыну. І, нарэшце — тая акалічнасць, што найважнейшыя, лёсавызначальныя падзеі Першай сусветнай адбываліся на беларускай зямлі.

Пісьменнік згадаў, што цікавасць да згаданага перыяду ў яго справакаваў фотаздымак маладога чалавека ў вайсковай форме, які ён пабачыў у сямейным альбоме. Зачапіўшыся думкай за гэты эпізод хронікі свайго роду, Вячаслаў Бандарэнка выйшаў на асэнсаванне падзеі глабальнага маштабу. Як вядома, у Вялікай вайне, як называлі яе сучаснікі, бралі ўдзел 38 краін. У прыватнасці, 50 працэнтаў мужчынскага насельніцтва Беларусі было мабілізавана ў войска. На думку аўтара, урокі Першай сусветнай дагэтуль не засвоены.

Кніга Вячаслава Бандарэнкі выйшла ў маскоўскім выдавецтве “Молодая гвардия”, у папулярнай серыі “Жыццё знакамітых людзей”. Яна складаецца з 12 нарысаў — біяграфій удзельнікаў вайны, якія належаць да розных сацыяльных груп Расійскай імперыі: гэта прадстаўнікі генералітэту, афіцэр флоту і авіятары, сын вялікага князя і данскі казак, сястра міласэрнасці, ваенны свяшчэннік і гусары… Праз канкрэтыку лёсаў ствараецца панарама вялікіх падзей.

У час прэзентацыі прысутныя пабачылі фрагменты новага мастацка-публіцыстычнага фільма “Святая Рыма”, створанага тэлекампаніяй “Ваен ТБ” і “Беларусьфільмам”. Ён прысвечаны адной з гераінь кнігі — сястры міласэрнасці Рыме Івановай. Яна была пасмяротна ўзнагароджана ордэнам Святога Георгія IV ступені, які паводле статуса прызначаўся толькі для афіцэраў і генералаў. Да Рымы Івановай, якая ўвогуле не мела воінскага звання, за ўсю гісторыю Расіі георгіеўскім кавалерам была толькі адна жанчына — сама заснавальніца ордэна імператрыца Кацярына II. Здымкі фільма праходзілі на месцах баёў у Беларусі, праз якія прайшла гераіня, і на яе радзіме ў Стаўрапалі.

Лёс іншых герояў кнігі таксама звязаны з ваеннымі падзеямі на беларускай зямлі. Тут, са Стаўкі ў Магілёве кіравалі войскамі генералы Міхаіл Аляксееў, Аляксей Брусілаў, Лаўр Карнілаў. Генерал Мікалай Юдзеніч ваяваў на іншым напрамку, але ягоныя родавыя карані — на Міншчыне. Легендарны казак Казьма Кручкоў здзейсніў адзін са сваіх подзвігаў у баі ля беларускай вёскі Людвінава, што на Вілейшчыне. У Полацкім кадэцкім корпусе вучыўся прадстаўнік імператарскай фаміліі князь Алег Раманаў, сын вялікага князя Канстанціна Канстанцінавіча. Ён быў паранены пад Вільняй, памёр у шпіталі. На нашай зямлі здзейснілі свае подзвігі першы ас рускай авіяцыі Аляксандр Казакоў і экіпаж самалёта “Ілля Мурамец-XVI”: Дзмітрый Макшэеў, Фарух Гаібаў, Мітрафан Рахмін і Алег Карпаў. Экіпаж загінуў ля вёскі Баруны.

Разбураныя будынкі на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці. Жнівень 1915 г.

Асобным раздзелам у кнізе змешчана храналогія асноўных падзей на рускім фронце Першай сусветнай вайны 1914 — 1918 гадоў, у якой пазначаны беларускія геаграфічныя назвы.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Эпоха ВМТ

Адсюль выйшаў той рэалізм, які радыкальна разбурыў падмурак авангарда

24 снежня адбудзецца XXI З'езд мастакоў Беларусі. А роўна 75 гадоў таму прайшоў Першы З'езд, на якім і быў утвораны Саюз мастакоў БССР (цяпер — Беларускі саюз мастакоў). На гэтым форуме большасць яго ўдзельнікаў склалі былыя педагогі ды выпускнікі Віцебскага мастацкага тэхнікума (вучылішча). І якраз сёлета ўвосень споўнілася 90 гадоў з дня заснавання гэтай вядомай у Беларусі і за яе межамі ўстановы — сапраўднай кузні нацыянальных кадраў мастакоў, якія заклалі фундамент сучаснай выяўленчай культуры нашай краіны.

Віцебск. Побач з гарадской ратушай, ля сцяны старадаўняга будынка з купалам, на рагу вуліц Суворава і Маякоўскага размяшчаецца Дзіцячая мастацкая школа № 1, а з 1923-га па 1941-ы тут знаходзіўся знакаміты Віцебскі мастацкі тэхнікум, перайменаваны ў 1934-м у вучылішча. На будынку — пяць мемарыяльных дошак: народнаму мастаку Беларусі і СССР Заіру Азгуру, народнаму мастаку Беларусі Андрэю Бембелю, народнаму мастаку Беларусі Сяргею Селіханаву, народнаму архітэктару СССР Уладзіміру Каралю і народнаму пісьменніку Беларусі Васілю Быкаву. Так, таму самаму Васілю Уладзіміравічу, які пасля заканчэння 9-га класа ў вёсцы Кублічы Ушацкага раёна падаўся ў Віцебскае мастацкае вучылішча. Быкава спачатку залічылі на жывапісна-педагагічнае аддзяленне, а потым, па яго жаданні, перавялі на скульптурнае. Тут ён вучыўся з 1938 года. Як потым пісьменнік напіша ў аўтабіяграфічнай аповесці "Доўгая дарога дамоў", "…толькі вучыцца там доўга не прыйшлося, таму што ў 1940 годзе стыпендыю адмянілі, і гэтая акалічнасць вярнула мяне ў вёску…".



Міхаіл Керзін — першы дырэктар Віцебскага мастацкага тэхнікума.

Сёння ў колішнім будынку ВМТ знаходзіцца віцебская Дзіцячая мастацкая школа № 1.

З.Азгур са сваімі скульптурамі "Будаўнік" і "Трактарыст". 1920-я гг.

Урэшце, і пры іншых абставінах будучы пісьменнік не змог бы скончыць вучылішча. Вайна надоўга перакрэсліла не толькі ягоныя творчыя планы, але і многіх яго равеснікаў, якія таксама марылі стаць вядомымі мастакамі, а вымушаны былі па поклічы Радзімы апрануць салдацкія шынялі…

Ды вернемся ў 1920-я.

…Пасля перамогі савецкай улады і заканчэння Грамадзянскай вайны перспектывы для здольных юнакоў творчага складу адкрываліся радасныя. Менавіта тагачасны Віцебск стаў своеасаблівай культурнай Мекай для ўсёй Беларусі, дзе зараджалася новае савецкае пралетарскае мастацтва. І ў гэтым выдатную ролю адыграў Віцебскі мастацкі тэхнікум. Першапачаткова такая школа прызначалася для абслугоўвання ўсёй заходняй часткі новай савецкай дзяржавы: у краіне дзейнічалі толькі чатыры падобныя школы. А калі ў красавіку 1924-га Віцебск разам з некалькімі паветамі Віцебскай губерні ўвайшоў у склад БССР, новая навучальная ўстанова атрымала назву "Беларускі мастацкі тэхнікум".

І што б пра яго ні казалі і не пісалі некаторыя ультракрытыкі тых часоў, іранічна называючы тэхнікум "нейкім аскепачкам малевічаўска-ермалаеўскага Віцебскага мастацка-практычнага інстытута", ён стаў, у поўным сэнсе, сапраўднай кузняй нацыянальных кадраў Савецкай Беларусі: жывапісцаў, скульптараў, графікаў, сцэнографаў, майстроў афарміцельскага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. І ў гэтай кузні кавалася тое мастацтва, што на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў стала "візітоўкай" сучаснай беларускай выяўленчай творчасці з усімі яе выдатнымі ўзлётамі і крыўднымі падзеннямі. Але, як бы там ні было, без традыцый Віцебскага мастацкага тэхнікума пасляваеннае і сучаснае мастацтва Беларусі было б іншым…

Пачыналася ўсё няпроста. Ужо напрыканцы 1921 года ў культурным жыцці Віцебшчыны стаў прыкметны яўны спад. І на тое былі свае прычыны, звязаныя з пераходам краіны да новай эканамічнай палітыкі, якая жорстка ўдарыла па сацыяльнай базе "левага" мастацтва. Прасцей кажучы, рэвалюцыйны супрэматызм страціў свой былы аўтарытэт у горадзе, у выніку чаго прадстаўнікі УНОВИСа аказаліся без фінансавай, матэрыяльнай ды маральнай падтрымкі з боку ўладных структур, у тым ліку — Галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі і Аддзела народнай адукацыі губернскага выканкама, якім была падпарадкавана ўся мастацкая дзейнасць горада і губерні. Апошні ўзлёт "левага" мастацтва адбыўся ў маі 1922-га ў час дэманстрацыі Трэцяй выстаўкі, арганізаванай К.Малевічам і ягонымі паплечнікамі. А экспазіцыя твораў вучняў Мастацка-практычнага інстытута, што адкрылася 13 мая 1923 года ў Доме асветы, наогул, сустрэла рэзкае асуджэнне ўдзельнікаў губернскага з'езда работнікаў мастацтва. Усе дзесяць першых (і апошніх) выпускнікоў інстытута, якія атрымалі званне мастакоў-канструктывістаў, раз'ехаліся хто куды…

Хаця, з іншага боку, заставаліся і абаронцы "адыходзячай натуры". Так, нейкі рабкар пад ініцыяламі "З-т" у газеце "Известия Витебского губисполкома и губкома РКП(б)" № 148 ад 5 ліпеня 1923 года адзначыў: гэтая выстаўка "…паказала, што інстытут правільна ацаніў задачы, якія стаяць перад ім на жыццёвым шляху і якія найбольш поўна адказваюць запытам дзяржавы і пралетарскага грамадства". А два дні да гэтага тая ж газета паведаміла, што з горада Веліжа (тагачасная Віцебская губерня), які праз некалькі месяцаў увойдзе ў склад Смаленскай вобласці, запрашаюцца на работу ў якасці педагогаў інстытута скульптар Міхаіл Керзін, жывапісцы Валянцін Волкаў і Міхаіл Эндэ. Усе трое — былыя выхаванцы пецярбургскай Акадэміі мастацтваў, якія даўно працавалі ў Веліжскай мастацкай школе.

Падкрэслю, што гэтае запрашэнне адбылося яшчэ за месяц да кардынальнай рэарганізацыі Мастацка-практычнага інстытута. Разам з гэтай тройкай педагогаў, праўда, крышачку пазней, з Веліжа прыехалі ў Віцебск таленавітая мастачка Марыя Лебедзева і жывапісец Уладзімір Хрусталёў, вучань Барыса Кустодзіева, — таксама былыя "акадэмісты". Праз некаторы час да гэтай групы далучыліся гадаванец Школы тэхнічнага рысавання барона Штыгліца кераміст Мікалай Міхалап (будучы першы дырэктар Беларускай дзяржаўнай карціннай галерэі), жывапісец і графік Фёдар Фогт і скульптар Гаўрыла Шульц, які атрымаў адукацыю ў ВХУТЕМАСе — ВХУТЕИНе. Пазней уклад у педагагічную дзейнасць тэхнікума ўнеслі таксама І.Ахрэмчык, Л.Лейтман, В.Дзежыц, В.Руцай, Д.Камароў (Комар), А.Мазалёў, З.Гарбавец, а таксама М.Каспяровіч, Я.Мінін і П.Даркевіч, незаконна рэпрэсаваныя ў 1937-м як "ворагі народа". Але ўсё гэта будзе потым…

А пакуль у жніўні — верасні 1923 года горад пакінулі апошнія магікане-супрэматысты на чале з К.Малевічам, якія апынуліся, так бы мовіць, у грамадскай ізаляцыі: большая частка з'ехала ў Петраград, каб у гэтым горадзе паспрабаваць рэалізаваць тыя ультрасучасныя мастацкія навацыі, якія ў сваёй аснове былі распрацаваны ў горадзе на Дзвіне. З былога складу педагагічных кадраў у Віцебску засталіся толькі Ю.Пэн ды яго маладыя памочнікі рэалістычнага кірунку А.Бразер, а таксама С.Юдовін і Я.Мінін, якія хутка, з-за жорсткіх рознагалоссяў з толькі што прызначаным дырэктарам тэхнікума М.Керзіным, пакінулі ўстанову (праўда, Я.Мінін пазней у тэхнікум вярнуўся).

Словам, лёс "левага" Віцебскага мастацка-практычнага інстытута (пераемніка Віцебскага народнага мастацкага вучылішча і Віцебскіх вышэйшых дзяржаўных мастацкіх тэхнічных майстэрняў), што праіснаваў акурат паўтара года (студзень 1922-га — чэрвень 1923-га), быў канчаткова вырашаны. Кароткая эпоха пад знакам Марка Шагала — Казіміра Малевіча, здавалася, сышла ў нябыт. Аднак праз сем-восем дзесяцігоддзяў яна зноў адродзіцца пад назвай "Віцебская мастацкая школа" і ўжо назаўсёды ўвойдзе ў гісторыю сусветнай выяўленчай культуры, якую будуць вывучаць нароўні з іншай аналагічнай мастацкай школай першай чвэрці XX ст. — Парыжскай…

Барыс КРЭПАК

Працяг чытайце ў наступных нумарах.

а • ф • і • ш • а «К»

З 16 ЛІСТАПАДА — ДА 23 ЛІСТАПАДА

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
■ Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.
■ Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.
■ Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.
■ Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.
■ Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.

Выстаўкі:
■ **"Слуцкія паясы"** (са збору Львоўскага гістарычнага музея) — да 18 красавіка 2014 г.
■ Міжнародная выстаўка **"Праваслаўны свет. Вобраз Хрыста ў іканаграфіі краін Усходняй Еўропы"** — да 5 снежня.
■ **"Венгерская рапсодыя. Мастакі Сольнака"** — да 25 лістапада.
■ Персанальная выстаўка Тацціяны і Юрыя Рудэнкаў **"Толькі вечныя каштоўнасці"** — да 5 снежня

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а.
Тэл.: 327 88 78.

■ Пастаянныя экспазіцыі:
"Парадныя залы", "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча", "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён.
Тэл.: 507 44 68.
■ Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.
Тэл.: (8–0222) 22 48 87.
■ Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
■ **"Старажытная Беларусь"**.
■ **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы"**.
■ **"Водбліскі ваеннай славы"**.
■ **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пач. XX стст."**.

Выстаўкі:
■ Выстаўка **"Прыгожая фатаграфія. Частка 1. Непатрэбнае сваяцтва"** — да 17 лістапада.
■ Выстаўка **"Сучасны японскі дызайн"** — да 21 лістапада.
■ Выстаўка **"Плакатная Ленініяна"** (са збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь) — да 6 снежня.

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а.
Тэл.: 290 68 47.

■ **"Пастка для часу"** — выстаўка дапатопных казурак у бурштыне — да 24 лістапада.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка фатаграфій **"Свет стары — свет новы"**.
■ Выстаўка **"Мірскі замак як брэнд"** — да 15 снежня.
■ Выстаўка сцэнічных касцюмаў па п'есе У.Караткевіча **"Ладдзя роспачы"** — да 6 снежня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.

Выстаўкі:
■ Выстаўка **"Якуб Колас у творчасці скульптараў"** з фондаў музея.
■ Выстаўка, прысвечаная творчасці Крысціёніса Данелайціса.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце.
■ Інтэрактыўная гульня **"У пошуках папараць-кветкі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
■ Дакументальна-мастацкая выстаўка **"Снілася дзяўчыне..."** да 120-годдзя з дня нараджэння Паўліны Мядзёлка.
■ Выстаўка **"Я вам прынёс напеў зямлі бацькоўскай..." Ян Райніс і беларуская культура".**

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а.
Тэл: 226 03 98.

Выстаўкі:
■ Мастацкая выстаўка **"Мінск — ведаць, памятаць, ганарыцца"** (да Дня горада Мінска).
■ Мастацкая выстаўка **"Герой. Патрыёт. Партызан"** (да 70-годдзя з дня гібелі Героя Савецкага Саюза Яна Налепкі).

■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.
■ Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца
Экспазіцыя:
■ **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

Выстаўкі:
■ **"Выдатнае і вечнае"** (выстаўка літаратуры к. XIX — пач. XX стст. са збору князёў Паскевічаў).

УВАГА!

ІДЗЕ ПАДПІСКА - 2014
НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА"

ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875
ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

Выстаўкі:
■ Выстаўка **"Якуб Колас у творчасці скульптараў"** з фондаў музея.
■ Выстаўка, прысвечаная творчасці Крысціёніса Данелайціса.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца
Выстаўкі:
■ Мастацкая выстаўка **"Нацюрморт. Паэма быцця"** — да 24 лістапада.
■ Выстаўка жывапісу **"Час кахання"** — да 18 лістапада.
■ Персанальная выстаўка жывапісу Дзмітрыя Яўсеенкі — да 1 снежня.
■ Выстаўка калекцыі Джорджыа Форні **"Made in Italy"** — да 15 снежня.

Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
■ Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
■ **"Чырвоная гасцёўня".**

■ **"Класікі беларускага мастацтва".**

Паўночнае крыло палаца
Экспазіцыя:
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстаўкі:
■ Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад
Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІІ

г. Гродна, вул. Замкавая, 16.
Тэл.: (8-0152) 74 25 13.

Экспазіцыі:
■ **"Рэлігія і культура ў Беларусі"** (ад старажытных часоў да XXI ст. — архаічныя вераванні, хрысціянскія канфесіі, іслам, іудаізм).
■ **"Эпоха. Час. Будынак"** (гісторыя палаца, у якім размешчаны музей, сямейныя традыцыі і каштоўнасці XIX — пач. XX стст.).

Выстаўкі:
■ **"Таямнічая сіла крыжа".**
■ **"Успамін аб матчынай хаце"** (да Дня маці) — да 8 снежня.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ Выстаўка **"Пераможная восень 1943 г."**.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 22 44.

■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выстаўкі:
■ **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна..."**.
■ **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст."**.
■ Выстаўка адной карціны **"Партызаны"**.
■ **"Прывітанне, ранейшая Ліда!"**.
■ **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60".**
■ Турыстычна-пазнавальная праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс.: 290 60 10.

■ Мастацкая юбілейная выстаўка Анатоля Пятровіча Жураўлёва **"Гарызонты"** — да 21 лістапада.
■ Мастацкая юбілейная выстаўка Мікалая Мікалаевіча Дундзіна **"Віцебская гісторыя"** — да 21 лістапада.
■ Мастацкая выстаўка Сяргея Цімохава, прысвечаная памяці творцы, — да 21 лістапада.
■ Мастацкая юбілейная выстаўка Генадзя Баляслававіча Козела **"Штрых-код"** — да 21 лістапада.

ТЭАТР

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.

■ **16 — "Кармэн"** Ж.Бізэ.
■ **17** — Вечар сучаснага балета ("Балет Яўгенія Панфілава" (Расія), "Fresco Dance Company" (Ізраіль).
■ **21 — "Па правілах музыкі"** (Музычныя вечары ў Вялікім Камерная зала імя Л.П. Александроўскай).
■ **23 — "Сем прыгажунь"** К.Караева.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7.
Тэл./факс: 227 60 81.

■ **16 — "Паўлінка"** Янкі Купалы.
■ **17 — "Чорная панна Нясвіжа"** А.Дударава.
■ **19 — "Офіс"** І.Лаўзунд.
■ **20, 21 — "Людзі на балоце"** І.Мележа
■ **22 — "Вячэра з прыдуркамі"** Ф.Вэбера.
■ **19 — "Местачковае кабарэ"**. На сцэне Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек.
■ **19 — "Гендэльбах"** П.Барца.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.

■ **16 — "А мне не сорамна!.."** Л.Усцінава.
■ **17 — "Дамавічкі"** Я.Конева. **"Адэль"** Я.Таганава.
■ **19 — "Янка Купала. Кругі раю"** С.Навуменка.
■ **20 — "Адамавы жарты"** С.Навуменка.
■ **21 — "Адвечная песня"** Янкі Купалы.
■ **22 — "Бегчы з Эльсінора, або Гамлет навыварат"** В.Понізава.
■ **23 — "Раскіданае гняздо"** Янкі Купалы.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.

■ **16, 22 — "Звычайны цуд"** Г.Гладкова.
■ **17 — Чырвоны Каптурык. Пакаленне NEXT"** А.Рыбнікава.
■ **17 — "Лятучая мыш"** І.Штраўса.
■ **19 — "Бабін бунт"** Я.Пцічкіна.
■ **20 — "Граф Люксембург"** Ф.Легара.
■ **21 — "Асоль"** У.Саўчыка.
■ **23 — "Чароўная лямпа Аладдзіна"** М.Самойлава.
■ **23 — "Блакітная камея"** К.Брэйтбурга.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

■ **16 — "Воўк і раз, два, тры..."** Н.Мацяш.
■ **17, 19 — "Бука"** М.Супоніна.
■ **20 — "Жураўлінае пяро"** Д.Кінасіта.
■ **21, 22, 23 — "Ямелева шчасце"** (па матывах рускіх народных казак).

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

Выдаецца з кастрычніка 1991 года

Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ

Рэдакцыя:
Дзмітрый ФІЛІПОВІЧ (адказны сакратар)

Рэдактары аддзелаў:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН

Спецкарэспандэнты:
Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Вольга НАВІЦКАЯ

Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ

Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД

Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС

Адрас рэдакцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.

Тэлефоны:
(017) 290 22 50,
(017) 286 07 97,
(017) 334 57 23

Тэлефон-факс:
(017) 334 57 41

Рэкламны аддзел:
тэл. (017) 334 57 41

www.kimpress.by
E-mail: kultura@tut.by

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.

"Культура", 2013.
Індэксы 63875, 638752
Кошт 4500 рублёў.

Наклад 6 853
Падпісана ў друк 15.11.2013 у 15.00
Замова 4884

Дзяржаўнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.

Прыёмная: (017) 290 22 50.

Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35

QR-код: